Комуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 206 (5039)
ВЕРАСНЯ 15 СУБОТА
1934 г.
год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Москва
ВКП(б) Сельхозотдел комната 639
Іосифову
34 г.
Звезда—1

Зацверджана ЦК ВКП(б)

Пастанова Цэнтральнай камісіі ВКП(б) па чыстцы

Падвяргаць чыстцы ўсіх начальнікаў палітаддзелаў, МТС і соўгасаў, знятых з работы за праступкі і бяздзейнасць.

Усіх б. начальнікаў палітаддзелаў, МТС і соўгасаў, знятых да гэтага часу, абавязаць прайсці партыйную чыстку ў 2-месячны тэрмін.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАМІСІЯ ВКП(б) ПА ЧЫСТЦЫ.

УСІМ РАЙКОМАМ ПАРТЫІ

Арганізуйце шырокую прапрацоўку рашэння ЦК КП(б)Б аб рабоце промкааперацыі, апублікаванага ў «Звяздзе» і «Рабочем» за 5 верасня, у партарганізацыях арцелей, саюзаў, а таксама сярод усёй масы арцельшчыкаў фактамі становішча работы промкааперацыі ў вашым раёне.

Забяспечце выкананне рашэння ЦК канкрэтнымі практычнымі мерапрыемствамі, разгарніце спаборніцтва за заваяванне сцяга ЦК і СНК, на лепшыя вынікі па падставе канкрэтных абавязацельстваў саюзаў, арцелей, кожнага арцельшчыка.

Сакратар ЦК КП(б)Б ВАЛКОВІЧ.

УСЕ СІЛЫ НА ВЫСОКАЯКАСНУЮ АПРАЦОЎКУ І ЗДАЧУ ІЛЬНУ ДЗЯРЖАВЕ, УЗДЫМ ЗЯБЛІВА, УБОРКУ І АДГРУЗКУ БУЛЬБЫ НАЙЛЕПШАЙ ЯКАСЦІ ЛЕНІНГРАДУ!

АЎЛАДАЦЬ МАРКСІСЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ТЭОРЫЯЙ

Кожны камуніст абавязан працаваць над сваёй ідэйнай узброенасцю, абавязан вывучыць марксізм-ленінізм. Гэты лозунг асабліва падкрэслен у новым статуце партыі, прынятым на XVII з'ездзе.

Мінулы навучальны год як ніколі паказаў ідэйна-палітычны рост шырокіх мас членаў і кандыдатаў партыі. Даклад тав. **Сталіна,** пастановы XVII партз'езда надзвычай узнялі зацікаўленасць да партыйнай вучобы кожнага камуніста і кандыдата партыі.

1934-35 навучальны год павінен даць новыя перамогі ў аўладанні вышынямі марксізма-ленінізма.

Кожны камуніст абавязан ведаць вучэнне **Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна.** Гэтага патрабуе сучасны этап сацыялістычнага будаўніцтва, да гэтага абавязвае статут нашай партыі.

Поспех аўладання маркса-ленінскай тэорыяй кожным камуністам залежыць выключна ад таго, наколькі партыйныя камітэты, парторгі здолеюць арганізаваць штодзённую дапамогу і кіраўніцтва работай школ. Аб гэтым перакануча сведчаць поспехі барысаўскай і менскай партарганізацый. Клопаты і адданасць, якія праяўляюць у Барысаве партыйныя кіраўнікі, райком КП(б)Б у асобе сакратара т. **Чарнышова** да падрыхтоўкі к заняткам у гэтым навучальным годзе, таксама і ў ходзе заняткаў мінулага года, безумоўна далі станоўчыя вынікі.

Тое-ж самае і ў менскай партыйнай арганізацыі, дзе ў сувязі з прапрацоўкай пастаноў XVII партз'езда значна палепшылася пастаноўка ўсёй партыйнай асветы. Асабліва заслугоўвае ўвагі разгорнутая работа розных семінараў для актыва, сетка школ і гурткоў на мове нацменшасцей.

Партарганізацыі друкарні імя **Сталіна,** заводаў імя **Молатава, Варашылава** і інш. разгарнулі новыя формы масавай вучобы — палітдні, палітмасоўкі, чытанне мастацкай літаратуры і інш.

Усё гэта вымагае асаблівай увагі марксісцка-ленінскаму выхаванню камуністаў з боку партыйных камітэтаў.

Выключна важным з'яўляецца пытанне аб прапагандыстах. Тут справа не толькі ў падборы, які безумоўна адыгрывае немалую ролю, гэтым яшчэ не вычэрпваецца задача. Партарганізацыі павінны ва працягу ўсяго навучальнага года штодзённа клапаціцца аб сістэматычным выхаванні прапагандыстаў, аб іх тэарэтычнай падрыхтоўцы, аб стварэнні спрыяючых умоў у выкладчыцкай рабоце і самаадукацыі прапагандыста.

Прапагандыст у сваёй рабоце не павінен забываць галоўны прынцып бальшавіцкай прапаганды, які выражан тав. **Кагановічам** на 17 з'ездзе, што «Бальшавік не школьнік, ён выхоўваецца палітычна, яго школьная вучоба павінна спалучацца з палітычнай і практычнай штодзённай барацьбой. Яго трэба выхоўваць і ў школе, і на партходзе».

Партыйная школа не можа быць адарвана ад жыцця як грамадска-, так і палітычнага. Прапагандыст абавязан ведаць практычную грамадска-вытворчую работу кожнага слухача-камуніста з тым, каб у школе даць правільны адказ на ўсе незразумелыя пытанні, узнікаючыя ў часе практычнай работы камуніста. Толькі спалучэнне тэарэтычных пытанняў школы з практычным жыццём камуніста дасць магчымасць выканаць гэту ўстаноўку тав. **Кагановіча.**

Вялікую ролю ў дапамозе прапагандысту павінны адыграць партыйныя габінеты. Яны павінны стаць арганізуючымі цэнтрамі кансультацый прапагандысту, дапамогі яму і слухачу нагляднымі дапаможнікамі, падручнікамі і інш. Але тут нельга ні ў якім разе перадаверыць усю справу марксісцка-ленінскага выхавання камуністаў партыйным габінетам, як гэта робіць мазырскі і чэрыкаўскі райкомы партыі. За партыйную асвету адказвае партыйны камітэт і ў першую чаргу яго сакратар.

Арганізацыя палітвучобы кіруючых партыйных, гаспадарчых і савецкіх работнікаў-камуністаў павінна разглядацца як адна з самых важных задач партыйнай работы.

«Партыйны кіраўнік павінен быць не толькі арганізатарам у лепшым сэнсе слова, але і прапагандыстам, выхавацелем членаў партыі» (**Кагановіч**). Ніякіх адгаворак і спасылання на занятасць не павінна быць. Справу партыйнай асветы трэба арганізаваць так, каб ні адзін камуніст, кандыдат партыі, спачуваючы, дзе-б ён ні працаваў, не астаўся па-за партыйнай вучобай.

Сёння першы дзень заняткаў партыйнай сеткі гарадскіх школ і прадпрыемстваў. У гэты дзень трэба яшчэ раз праверыць, як падрыхтавана памяшканне, ці адпавядае яно заняткам, ці забяспечаны слухачы належнай колькасцю падручнікаў, прылад з тым, каб да чарговых заняткаў ліквідаваць недахопы.

Чоткая арганізаванасць, прыкладны парадак, моцная дысцыпліна, высокая якасць прапаганды павінны быць з першага дня вучобы, з першага дня заняткаў школ і гурткоў. Соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам павінна быць прасякнута работа партыйных камітэтаў па кіраўніцтву вучобай камуніста.

Вясковыя партыйныя арганізацыі пачынаюць заняткі 1 кастрычніка. Час, што астаўся, павінен быць максімальна выкарыстан для высвятлення, дзе якія школы арганізоўваюцца, іх камплектаванне, забеспячэнне прапагандыстамі і падручнікамі.

Вялікую ўвагу неабходна звярнуць на ход партыйнай вучобы **камуністаў-адзіночак.** Тут асаблівую ролю павінны адыграць інструктары. Прамы абавязак інструктара—дапамагчы арганізаваць вучобу камуністаў яго зоны.

Размовы аб партыйнай вучобе, як гэта робяць у Смалявічах і Чэрыкаве, без канкрэтнай работы не патрэбны. Практычная дзелавая работа, накіраваная на поўны ахоп усіх камуністаў партыйнай вучобай у залежнасці ад іх падрыхтаванасці, стварэнне ўмоў для бесперабойнай работы школ, гурткоў —вось што патрэбна.

ЗАХОДНЯЯ ВОБЛАСЦЬ ВЫКАНАЛА ПЛАН ХЛЕБАЗДАЧЫ

ЦК ВКП(б)—т т. Сталіну, Кагановічу
Соўнаркому СССР—тав. Молатаву

Заходняя вобласць устаноўлены для яе ЦК ВКП(б) і ўрадам план хлебапаставак выканала поўнасцю 10 верасня. Прымаем канкрэтныя меры, каб у бліжэйшыя дні забяспечыць выкананне плана тымі калгасамі, соўгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі, якія яшчэ план не выканалі.

Пераключаем сілы на апрацоўку і выкананне плана загатовак ільну высокай якасці, плана бульбапаставак. Разгортваем хлебазакупкі.

Сакратар Зах. абкома ВКП(б) **РУМЯНЦАЎ.**

Старшыня абл. выканкома **РАКІТАЎ.**

Нач. Палітсектара МТС ІЛЬІНСКІ.

Менск, ЦК КП(б)Б—т. Гікало, копія СНК БССР—т. Галадзеду, ЦК ЛКСМБ—т. Аўгустайцісу

СЕВАСТОПАЛЬ, 14. (Па тэлеграфу).

Асабовы склад падшэфнага лінкора вітае ўрад, працоўных БССР з выкананнем плана хлебапаставак. Ваша перамога для нас — байцоў і камандзіраў падшэфнага карабля — служыць стымулам для яшчэ лепшай барацьбы за баявую палітычную падрыхтоўку. Мы ганарымся вашымі поспехамі, заваяванымі бальшавікамі Беларусі пад кіраўніцтвам тав. Сталіна — вялікага арганізатара перамог калгаснага ладу нашай сацыялістычнай радзімы.

Камандзір карабля ПУГА.
Камісар БАКУЛІН.

ПАСТАНОВА КАМІСІІ ПА СПАБОРНІЦТВУ З ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦЮ

За здавальняючыя тэмпы правядзення зябліва, уборкі бульбы і выкананне плана сіласавання сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР пакінуць за АРШАНСКІМ раёнам, папярэдзіўшы кіраўніцтва раёна аб неабходнасці ўзмацнення тэмпаў перапрацоўкі і здачы ільнапрадукцыі.

Кандыдатамі на атрыманне сцяга пакінуць МЕНСКІ, СЛУЦКІ, ЧЫРВОНАСЛАБОДСКІ і ХОЙНІЦКІ раёны, папярэдзіўшы кіраўніцтва гэтых раёнаў, што калі ў бліжэйшую пяцідзёнку не будзе зроблен рашучы пералом у ільнозагатоўках і ўзняцці зябліва, яны будуць зняты з ліку кандыдатаў на атрыманне пераходнага сцяга.

За зусім нездавальняючыя тэмпы загатовак зярна па аднаасобнаму сектару, нездавальняючыя тэмпы выканання плана ільнапрадукцыі зняць ЧЭРЫКАЎСКІ раён з ліку кандыдатаў на атрыманне сцяга.

За нездавальняючыя тэмпы здачы ільнапрадукцыі і зябліва адабраць чырвоны сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР па ільнаводчай зоне ад БЕШАНКОВІЦКАГА раёна.

Адзначыць, што СЕННЕНСКІ раён па выкананню плана здачы ільнапрадукцыі мае права на атрыманне чырвонага сцяга. Але, прымаючы пад увагу зусім слабыя тэмпы загатовак зярна, зябліва ворыва і ўборкі бульбы, сцяг Сенненскаму раёну не перадаваць. Пытанне аб перадачы сцяга пакінуць адкрытым.

Кандыдатамі на атрыманне сцяга па ільнаводчай зоне пакінуць Сенненскі і Бешанковіцкі раёны. Дадаткова занесці ДРЫСЕНСКІ і ЛЁЗНЕНСКІ раёны, папярэдзіўшы кіраўніцтва гэтых раёнаў аб неабходнасці ўзмацнення тэмпаў здачы ільнапрадукцыі, зябліва ворыва і неадкладнага завяршэння плана хлебапаставак, а Дрысенскі—аб неабходнасці стварэння рашучага пералома ў выкананні плана загатовак ільнасемя.

Камісія адзначае зусім ганебныя тэмпы здачы зярна дзяржаве па аднаасобнаму сектару па Касцюковіцкаму, Ельскаму, Мсціслаўскаму, Чашніцкаму, Чэрыкаўскаму і Чырвонапольскаму раёнах, што кіраўніцтва гэтых раёнаў з неаднаразовых папярэджанняў камісіі не зрабіла для сябе ніякіх вывадаў.

Камісія папярэджвае кіраўніцтва ўсіх раёнаў БССР, што ацэнка работы раёнаў будзе зроблена выходзячы з паспяховага правядзення зяблівага ворыва, здачы ільнапрадукцыі дзяржаве, сіласавання і падрыхтоўкі да зімоўкі жывёлы, высокаякаснага правядзення ўборкі і адгрузкі бульбы Ленінграду.

РАЁНЫ, ЯКІЯ ЗРЫВАЮЦЬ ВЫКАНАННЕ ПЛАНА ХЛЕБАЗДАЧЫ ПА АДНААСОБНАМУ СЕКТАРУ

РАЁНЫ	Проц. выканання плана
Касцюковіцкі	52,0
Ельскі	51,5
Мсціслаўскі	62,3
Чашніцкі	64,5
Чэрыкаўскі	65,8
Сенненскі	68,1
Чырвонапольскі	68,5
Расонскі	71,8
Дубровенскі	73,6

ПЕРАДАВІКІ СЯЎБЫ

ЖЛОБІН.

Калгас **імя Касарэва** поўнасцю закончыў сяўбу азімых. Засеяна 130 гектараў жыта і 12 гектараў пшаніцы. Сяўба праведзена па добра апрацаванай і ўгноенай глебе.

За час сяўбы ў калгас уступіла 46 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Скончыў сяўбу азімых і калгас «Чырвоны Радуцін». У калгасе пачата ўборка бульбы. Заданне па бульбаздачы ў размеры 200 цэнтнераў калгас выканаў поўнасцю.

Л. З.

ЛЕЛЬЧЫЦКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ПЛАН СІЛАСАВАННЯ

ЛЕЛЬЧЫЦЫ. (Па тэлеграфу).

На аснове сацыялістычнага спаборніцтва сельсаветаў, калгасаў і жывёлагадоўчых ферм за моцную кармовую базу Лельчыцкі раён 10 верасня выканаў план сіласавання на 100,8 проц. План 4.360 тон, засіласавана 4.398 тон. Прадаўжаем сіласаванне і другі ўкос. Разгорнут збор жалудоў.

КЛІМОВІЧ, ЧАРВЯКОЎ.

АДКРЫЎСЯ ПЯТЫ ПЛЕНУМ ЦСПСБ

Учора вечарам у клубе імя VII з'езда прафсаюзаў адкрыўся V пленум ЦСПСБ. Пленум адкрыў старшыня ЦСПСБ тав. **Кавальчук.** Пасля зацвярджэння парадку дня па першаму пытанню быў заслухан даклад старшыні ЦСПСБ тав. **Кавальчука** аб рашэннях бюро ЦК КП(б)Б па дакладу аб рабоце прафсаюзаў і рашэннях IV пленума ВЦСПС аб перабудове прафсаюзаў.

У сваім двухгадзінным дакладзе тав. **Кавальчук** спыніўся на тых дасягненнях, якіх дабіліся прафсаюзы БССР за апошні час. Пытанні тэхнічнай вучобы, павышэння зарплаты нізкааплачваемым рабочым, падзялення рабочых сем'яў індывідуальнымі гародамі, сацыяльнага страхавання — асноўныя паказальнікі поспехаў нашай работы.

— Аднак, трэба папярэдзіць тых прафсаюзных работнікаў, якія мяркуюць, што ў нас усё добра і няма ніякіх недахопаў.

Тав. Кавальчук падвергнуў рэзкай крытыцы асноўныя недахопы работы асобных прафсаюзаў і ніжавых фабрычна-заводскіх камітэтаў.

У другой частцы свайго даклада тав. **Кавальчук** спыніўся на рашэннях IV пленума ВЦСПС аб перабудове прафсаюзаў. Абодва гэтыя рашэнні павінны быць даведзены да шырачайшых мас рабочых. Дакладам тав. Кавальчука закрылася першае пасяджэнне пленума.

ПРАСУНУЦЬ ТАВАРЫ НА ЗАКУПКУ ХЛЕБА

Не гледзячы на тое, што ў цэлым радзе раёнаў загатоўчыя арганізацыі гатовы да закупкі хлеба, яны ўсё-ж не атрымалі неабходнай ім колькасці тавараў.

З Полацка пішуць: «прыступілі к закупцы хлеба, тавараў стымулявання няма. Прашу тэрмінова выслаць.

Загадчык райсаюза Браўдэ».

Аналагічную тэлеграму мы атрымалі з Буда-Кашалёва: «Высылайце тавары для стымулявання хлебазакупак. Затрымліваюцца хлебазакупкі».

«Поўная адсутнасць промтаварных фондаў у Закупхлеба не дае магчымасці праводзіць закупкі», — піша з Чырвонаслабодскага раёна т. Свердлін. Такую-ж самую тэлеграму прыслаў з Чэрыкава тав. Азерскі: «Памяшканне Закупхлеба прыстасавана, тавараў для стымулявання няма — Азерскі».

Гэтыя тэлеграмы — сведка таго, што Белкаапсаюз яшчэ не забяспечыў сваім апаратыўным кіраўніцтвам работу па хлебазакупцы, не здолеў насыціць райспажыўсаюзы і пункты па закупцы хлеба лепшымі, высокаякаснымі таварамі.

Але гэтыя тэлеграмы яшчэ сведчаць і аб тым, што асобныя кіраўнікі райспажыўсаюза таксама не забяспечылі неабходнай аператыўнасці, не здолелі пераключыць наяўныя лепшыя фондавыя тавары на закупку хлеба.

ДЗЯРЖАВА КУПЛЯЕ ХЛЕБ

Калодзішчанскае сельпо менскага райспажыўсаюза на ўчарашні дзень ужо закупіла 17 тон хлеба. Калгас **«Ударнік»** гэтага-ж сельсовета прадаў 3.014 кілограм, калгас імя **Леніна** — 3055 кгр., калгас **«Комсамолец»** — 3644 кгр., калгас **«Перамога»** — 2465 кгр., калгас **«Бальшавік»** — 3859 кгр.

Сёння райспажыўсаюз адпраўляе ў Калодзішчанскі сельсовет грузавую машыну з востра-дэфіцытнымі таварамі. Сярод гэтых тавараў — веласіпеды, гадзіннікі, шкло, цвікі і інш. дэфіцытныя тавары.

* *
*

На ўчарашні дзень **Рагачоўскі** райспажыўсаюз **закупіў ужо 5 тон хлеба.** Ва ўсе сельсоветы пасланы спецыяльныя ўпаўнаважаныя РК і РВК па разгортванню масавай работы, па растлумачэнню значэння хлебазакупак.

Ход загатоўкі ільнапрадукцыі, падняцця ільну са сцелішчаў, сіласавання, уборкі бульбы, азімай сяўбы, зябліва па БССР

на 10 верасня 1934 года ў проц.

РАЁНЫ	Здача ільнапрад. кцыі ў пераводзе на валакно	Здача ільнасемя	Падняцце ільну са сцелішча	Засіласавана	Уборка бульбы	Засеяна азімых	У тым ліку пшаніцы	Заз'яблена
1. Сенненскі	35,2	100,1	67,2	100,3	3,8	81,1	60,1	3,8
2. Дрысенскі	18,5	46,3	65,4	60,6	2,8	77,2	78,7	10,5
3. Лёзненскі	17,2	85,6	60,4	65,8	6,8	85,0	88,0	8,5
4. Касцюковіцкі	13,8	89,9	50,8	83,0	9,7	95,8	90,7	19,3
5. Бешанковіцкі	10.7	93,6	76,7	64,7	14,3	88,4	70,7	3,9
6. Цэрахаўскі	9,5	77,3	42,8	80,4	15,8	93,2	100,2	5,7
7. Аршанскі	7,4	101,6	67,2	113,1	23,7	101,9	95,8	50,9
8. Крычаўскі	6,6	78,5	46,9	101,5	—	100,5	109,3	23,7
9. Горацкі	5,9	80,1	43,1	47,5	7,4	86,9	85,9	15,6
10. Суражскі	5.5	77,9	28,1	61,0	21,0	91,2	81,0	13,5
11. Рагачоўскі	5,4	55,3	67,6	68,5	18,5	86,7	85,2	15,5
12. Чавускі	5.2	69,7	54,7	130,5	9,1	88,9	103,3	12,0
13. Шклоўскі	5,0	63,5	52,7	54,4	10,4	90,2	46,8	7,4
14. Чырвонапольскі	4.9	28,7	27,9	69,6	4,3	76,7	43,0	4,6
15. Гарадоцкі	4.9	72,3	35,7	57,0	17,2	96,0	78,9	5,2
16. Полацкі	4,7	87,6	49,7	69,2	—	88,7	84,2	10,1
17. Талачынскі	3,1	66,6	45,2	75,7	8,1	80,0	51,6	6,4
18. Прапойскі	2,6	75,1	100,0	103,6	10,0	99,6	92,0	34,2
19. Сіроцінскі	2,5	71,9	34,8	119,8	15,2	90,7	91,3	12,7
20. Крупскі	2.3	68,8	40,5	79,6	3,6	89,6	50,6	11,4
21. Чэрыкаўскі	2,1	74,1	53,5	143,6	10.7	100,2	93,7	16,5
22. Чашніцкі	1,8	82,9	21,2	37,1	16,1	82,0	78,0	2,0
23. Мсціслаўскі	1,8	47,2	42,7	49,6	—	87,0	47,0	5,9
24. Карманскі	1,7	52,5	20,8	78,2	9,3	90,2	26,1	12,9
25. Асвейскі	1,6	51,2	63,9	35,2	6,6	85,0	77,0	4,2
26. Ушацкі	1.6	58,5	26,0	100,6	7,5	78,9	69,8	7,3
27. Магілеўскі	1,4	63,3	46,3	66,6	10,4	100,0	99,3	30,0
28. Расонскі	1,4	53,8	72,1	20,7	2,7	60,5	28,6	4,3
29. Лепельскі	1,4	60,7	39,2	65,8	9,0	88,2	83,2	4,7
30. Бабруйскі	1,3	55,0	24,0	66,4	16,8	85,[illegible]	71,0	22,5
31. Пухавіцкі	1.1	56,9	4,4	62,8	8,5	87,7	88,8	14,2
32. Бялыніцкі	0,8	58,7	25,7	120,9	15,1	95,2	73,6	23,9
33. Лагойскі	0,8	59,9	11,9	42,7	3,5	82,4	72,0	23,7
34. Брагінскі	0,6	61,6	44,3	69,0	13,4	76,9	53,3	6,9
35. Старобінскі	0,5	67,2	18,6	71,1	14,7	99,7	104,3	24,7
36. Веткаўскі	0,5	63,0	33,1	69,9	6,6	70,6	76,4	22,5
37. Буда-Кашалёўскі	0,5	79,2	24,5	74,5	22,4	75,2	80,0	30,4
38. Слуцкі	0,4	93,1	11,3	91,7	21,0	100,0	99,4	33,8
39. Жлобінскі	0,4	68,8	23,1	78,8	20,0	91,7	83,3	22,7
40. Быхаўскі	0,4	55,4	20,7	59,9	5,6	90,2	16,8	28,5
41. Лельчыцкі	0,4	49,8	18,0	97,7	—	77,0	64,0	14,4
42. Любанскі	0,3	73,6	38,0	95,0	27,5	100,0	100,0	40,6
43. Камарынскі	0,3	86,7	22,5	69,2	11,9	79,5	48,3	26,3
44. Клімавіцкі	0,3	77,2	19,9	59,4	2,6	96,2	77,8	1,9
45. Бярэзінскі	0,3	74,9	10,2	87,0	9,5	97,4	75,6	21,5
46. Уздзенскі	0,2	90,7	2,1	68,3	7,7	100,0	87,0	20,1
47. Барысаўскі	0,2	59,3	36,2	112,5	22,2	100,0	101,0	50,7
48. Тураўскі	0,2	105,5	18,5	106,5	32,0	81,8	79,1	49,4
49. Плешчаніцкі	0,2	71,8	4,2	73,5	—	76,9	44,0	10,8
50. Чэрвеньскі	0,2	73,1	2,6	95,8	12,9	88,4	51,0	11,8
51. Дубровенскі	0,2	66,1	25,9	59,6	2,2	100,2	77,1	9,6
52. Уваравіцкі	0.07	52,9	1,9	105,3	9,1	84,5	54,5	9,7
53. Чачэрскі	0.07	49,6	20,3	75,6	4,0	76,2	43,7	5,7
54. Менскі	—	104,8	12,9	95,0	9,0	100,0	95,7	12,9
55. Жыткавіцкі	—	65,3	13,3	93,8	—	78,1	60,7	40,4
56. Мазырскі	—	69,6	4,7	88,0	15,6	84,1	60,2	33,0
57. Парыцкі	—	62,3	11,6	87,7	25,3	94,6	66,0	25,3
58. Ельскі	—	78,7	9,9	84,5	31,9	77,7	21,5	18,9
59. Глускі	—	77,5	16,7	82,6	4,6	95,9	87,3	16,9
60. Капыльскі	—	76,6	4,2	80,2	5,4	92,0	89,6	25,4
61. Чырвонаслабодскі	—	100.0	33,5	77,0	27,4	101,2	100,5	32,7
62. Клічаўскі	—	47,5	22,8	73,3	35,3	93,9	92,0	32,0
63. Смалявіцкі	—	79,4	1,6	72,8	11,5	94,2	82,2	19,3
64. Асіповіцкі	—	89,4	11,2	72,6	6,1	78,3	61,8	18,2
65. Рэчыцкі	—	67,1	6,5	68,7	2,8	78,9	50,9	12,8
66. Лоеўскі	—	86,2	99,8	65,5	14,4	75,3	70,5	22,3
67. Нараўлянскі	—	48,9	12,1	64,1	12,1	81,1	31,4	10,9
68. Віцебскі	—	67,9	47,1	63,9	6,2	93,0	100,4	11,3
69. Заслаўскі	—	56,6	1,1	59,2	3,6	80,9	21,5	16,5
70. Бягомльскі	—	62,0	4,8	58,5	1,3	100,8	91,3	15,7
71. Хойніцкі	—	57,9	34,9	57,4	17,1	98,6	100,0	24,9
72. Петрыкоўскі	—	64,3	10,3	56,2	21,2	68,6	63,3	44,2
73. Дзяржынскі	—	72,2	3,9	49,9	4,9	79,5	78,4	26,8
74. Гомельскі	—	58,3	0,4	49,4	16,9	74,3	103,0	16,8
75. Старадарожскі	—	57,1	8,5	40,5	9,0	67,8	66,0	24,9
Разам па БССР:	5,3	69,7	39,4	77,9	11,4	88,8	80,0	18,2

УСІМ ГАРКОМАМ, РАЙКОМАМ, КАМІТЭТАМ І ПЯРВІЧНЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ КП(б)Б І ЛКСМБ

Праводзімыя, згодна рашэння ЦК ВЛКСМ, з 5 па 20 верасня перавыбары піонерскага актыва павінны ўзмацніць партыйнае і комсамольскае кіраўніцтва піонерскай арганізацыяй, павысіць увагу і клопаты нізавых партыйных і комсамольскіх арганізацый і ўсёй грамадскасці да работы сваіх піонерскіх атрадаў.

Перавыбары адначасова ўсіх звенняў піонерскага актыва — старшынь саветаў атрадаў, рэдактараў насценгазет, важатых звенняў, сцяганосцаў, барабаншчыкаў, гарністаў — набываюць асаблівае значэнне ў выхаванні юных піонераў дысцыпліны, актыўнасці, павагі да рэвалюцыйнай сімволікі, любові да партыі, комсамола, павышаюць актыўнасць самых дзяцей за работу сваёй арганізацыі.

ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ абавязваюць партыйна-комсамольскія арганізацыі прыняць актыўны ўдзел у перавыбарах піонерскага актыва і правесці іх такім чынам, каб у кожным піонерскім атрадзе быў добры комсамолец-важаты, партпрымацаваны, каб у часе перавыбараў кожны атрад атрымаў ад сваёй партыйнай і комсамольскай арганізацыі сцяг, барабан, горн; забяспечыць піонерскія атрады памяшканнямі для правядзення работ у рабочых клубах, дамах соцкультуры, жактах і т. д.

Комуністы, комсамольцы, ударнікі — рабочыя і калгаснікі, чырвонаармейцы партызаны, павінны прыняць удзел на зборах пры перавыбарах піонерактыва, браць на сябе канкрэтныя абавязацельствы па дапамозе атрадам, памятаючы, што «работа сярод дзяцей павінна быць іх бальшавіцкім гонарам»; у першую чаргу садзейнічаць каб добрай работай піонератрадаў піонеры заўсёды былі перадавымі ў вучобе, дысцыпліне і культурнасці.

Сакратар ЦК КП(б)Б ВАЛКОВІЧ.

Сакратар ЦК ЛКСМБ АЎГУСТАЙЦІС.

БРЫГАДА ПОЕЗДА № 11 АРЫШТАВАНА ЯПОНА-МАНЧЖУРСКІМІ УЛАДАМІ

ХАБАРАЎСК, 12 верасня. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Харбіна, 11 верасня выкліканы для допыту, перададзены ў японскае жандармскае ўпраўленне і да гэтага часу не вызвалены 10 савецкіх грамадзян з ліку паязной і паравознай брыгады поезда № 11, які пацярпеў крушэнне і падвергся нападу на паўднёвай ветцы КУЧ у ноч на 31 жніўня. Арыштаваныя, як вядома, праявілі ў часе крушэння і нападу вялікую самаахвярнасць і мужнасць. Факт затрымання брыгады поезда № 11 выклікаў сярод чыгуначнікаў КУЧ выбух абурэння.

Мужныя паводзіны савецкіх грамадзян у часе нападу на поезд на паўднёвай ветцы КУЧ

ХАБАРАЎСК, 11 верасня. (БЕЛТА). Паведамляемыя з Харбіна падрабязнасці здарыўшагася на паўднёвай ветцы КУЧ у ноч на 31 жніўня крушэння поезда № 11 і нападу на яго рысуюць карціну, зусім процілеглую тым грубатэндэнцыйным паведамленням аб гэтым факце, якія публікаваліся ў антысавецкіх мэтах япона-манчжурскім друкам. Як вядома, адзін са злосных вымыслаў харбінскіх газет, скарыстаўшых гэта здарэнне для паўтарэння паклёпу аб «сувязі савецкіх служачых з бандытамі», заключаўся ў сцвярджэнні, быццам у момант крушэння і наследваўшага за ім нападу на поезд савецкія грамадзяне—служачыя дарогі «скрыліся», і таму, моў, не пастрадалі.

У сапраўднасці ўстаноўлена, што служачыя дарогі праявілі ў часе крушэння і нападу максімум самаахвярнасці, мужнасці і ўсведамлення доўга. Так, у момант нападу машыніст паравоза **Товітаў** з небяспекай для жыцця, не страціўшы прысутнасці духу, здолеў зрабіць экстранае тармажэнне і выключыць электрычнае асвятленне паравоза (што затрудніла нападаўшым паследаваўшы за крушэннем абстрэл поезда). Паязная брыгада ў часе крушэння і пасля яго прымала энергічныя меры да прадухілення ўтаржэння нападаўшых у поезд. Праваднік вагона першага і другога класа **Ольхоўскі** і праваднік вагона трэцяга класа **Літвінаў** пад абстрэлам запіралі ўваходныя дзверы вагонаў. Неадкладна пасля ўходу нападаўшых паравозная і паязная брыгады прабавалі прыняць неабходныя меры дапамогі пацярпеўшым. Аднак, супрацьдзеянне паставіў поезд узброеная ахова забараніла выхад з вагонаў і перасоўванне па поезду да світання і затрымала аказанне першай дапамогі пацярпеўшым да прыходу дапаможнага поезда.

Аб здарэнні ўпраўленне дарогі было паведамлена галоўным кандуктарам поезда, які ўключыўся ў дыспетчарскі тэлефон. Аднак, у хуткім часе тэлефон быў у яго адабран сіламі чынамі ахоўных войск, з прычыны чаго ўпраўленне дарогі на працягу доўгага часу не мела сувязі з месцам крушэння, што затрудніла своечасовае атрыманне неабходных вестак.

У сувязі з крушэннем на паўднёвай ветцы трэба ўспомніць, што ўпраўленне КУЧ неадкаразова ўказвала штабу ахоўных войск на неабходнасць узмацнення аховы паўднёвай веткі КУЧ, у прыватнасці руху начных паяздоў. У адказ на гэтыя ўказанні штаб запэўніваў, што бяспечнасць руху забяспечана, а ў сапраўднасці не прымаў неабходных мер, што пацвердзілася ў сувязі з крушэннем поезда № 11.

ПАТРАБАВАННІ САВЕЦКАГА КОНСУЛА АБ ЛЕПШЫМ АБЫХОДЖАННІ З АРЫШТАВАНЫМІ ЧАСТКОВА ЗАДАВОЛЕНЫ

ХАБАРАЎСК, 11 верасня. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Харбіна, шматразовыя патрабаванні генеральнага консула СССР аб лепшым абыходжанні з арыштаванымі савецкімі грамадзянамі работнікамі КУЧ мела некаторае дзеянне. Часткова задаволена адно з патрабаванняў консульства аб дазволе перадач арыштаваным. Далей, па патрабаванню генеральнага консула СССР звольнен супрацоўнік паліцэйскага упраўлення белагвардзеец, па абвіназу якога ляжаў прыём членаў сем'яў арыштаваных савецкіх грамадзян. Савецкае генеральнае консульства прадаўжае дабівацца задаволення раду другіх патрабаванняў, накіраваных на забеспячэнне арыштаваным савецкім грамадзянам належачых умоў трымання і на ахову іх ад актаў насілля.

На тэмы дня

КНІГУ—МАСАВАМУ ЧЫТАЧУ

Проста здзіўляючыя рэзультаты ў галіне развіцця бібліятэчнай справы, як аднаго з сур'ёзных элементаў нацыянальна-культурнага будаўніцтва, маем мы ў Совецкай Беларусі. Даволі сказаць, што калі ў 1928 годзе мы мелі па БССР 631 стацыянарную бібліятэку з фондам у 1 з пал. млн. кніжак, то ў 1933 годзе —праз пяць год—лік бібліятэк павялічыўся да 1427, а кніжны фонд амаль падвоіўся. Прычым, у прыведзеныя намі лічбы не ўваходзіць Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна з фондам 1.300 тыс. кніг, дробныя бібліятэкі ў школах, хатах-чытальнях, на прадпрыемствах, соўгасах і калгасах.

Нашы совецкія бібліятэкі раскінуты літаральна па ўсёй краіне. Паводле пастановы ЦВК і СНК БССР у 1934-35 годзе ўсе калгасы будуць забяспечаны стацыянарнымі або перасовачнымі бібліятэкамі, а за 2-ую пяцігодку кніжны фонд у масавых бібліятэках павялічыцца не менш як у 3 разы, а па вёсцы —не менш як у 5 раз. Нашы бібліятэкі абслугоўваюць чытача кнігамі на яго РОДНАЙ МОВЕ, чаго не было і не магло быць у царскай Расіі.

І на фоне гэтых гістарычных па свайму значэнню культурных перамог, асабліва абураюць кожнага, каму дорага справа нашага культурнага росту (а, значыць, і справа соцыялістычнага будаўніцтва), тыя шкодніцкія адносіны да бібліятэк, якія праяўляюць часамі заўзятыя ворагі соцыялістычнай культуры або проста блізарукія «шляпы», нездольныя разумець гістарычнага значэння культурнага ўздыму, які адбываецца ў нашай краіне, надзённай неабходнасці задаволіць усё больш узрастаючую прагнасць мас да культурнага жыцця.

Карэспандэнцыя з ЧЭРЫКАВА, якую мы надрукавалі ўчора, ярка характарызуе такія недапушчальныя адносіны да бібліятэкі.

На жаль, падобныя факты не адзіныя. У мястэчку СТРЭШЫН Жлобінскага раёна, была нядрэнная бібліятэка. Цяпер яна ЗНІКЛА. Кнігі, разданыя на рукі, не спагнаны. Астатнія дзеліся невядома куды. АСІПАВІЦКАЯ бібліятэка на час хлебапаставак зусім закрыта, бо ўваход у яе засыпан зярном.

Бібліятэка ВІЦЕБСКАГА КЛУБА ГАРБАРОЎ, як паведамляе тав. МОРДХІНА, ужо некалькі год не папаўняецца. ЦП саюза гарбароў асігнавала для бібліятэкі на 1934 год усяго 1000 руб. Між тым, гадавая падпіска на неабходныя газеты і журналы складае 1.300 руб. Такім чынам на набыццё кніг бібліятэка «атрымлівае»... мінус 300 руб. Адміністрацыя, пасля настойлівых патрабаванняў бібліятэкара, зміласцівілася і адпусціла на кнігі «са сваіх гаспадарчых сродкаў... 39 руб. на ўвесь год.

Шмат скаргаў паступае ў «Звязду» на дрэннае абслугоўванне чытача. Так, ЖЛОБІНСКАЯ бібліятэка закрыта ў агульна-выхадны дзень, калі і гарадскім жыхарам зручней абменьваць кнігі, і з раёну з'язджаюцца на базар калгаснікі і аднаасобнікі. Нават Дзяржаўная бібліятэка імя Леніна — і тая мае рад недахопаў у абслугоўванні чытача. «Для таго, каб атрымаць патрэбную кніжку», піша ў «Звязду» студэнт РАХМАНЬКО, «трэба прастаяць у чарзе больш поўгадзіны, і бывае, што замест кнігі атрымаеш адказ: такой у нас няма. Свежых газет і журналаў у чытальню паступае мала. У чытальнай зале шумна. Бібліятэка закрываецца занадта рана».

Усе гэтыя сігналы, таксама як надрукаваныя нядаўна ў «Звяздзе» сігналы са Шклова і Дрыбіна, павінны звярнуць на сябе ўвагу Наркомасветы і мясцовых партыйных і совецкіх органаў. Для работы бібліятэк павінны быць складзены найлепшыя ўмовы.

ЗНАТНЫЯ ЛЮДЗІ БССР

Лепшы брыгадзір сплава

Сцяпан Грыгор'евіч Туфар з'яўляецца лепшым брыгадзірам лесасплаву ў БССР. Яго імя вядома не толькі ў Беларусі, але і ў Саюзе. У мінулым годзе ён на злёце ўдарнікаў лесасплаву ў Архангельску прэміраван касцюмам і ганаровай граматай ударніка. Яго метад работы — гэта метад Нікіты Ізотава: спачатку выканаць цяжкую работу, потым лягчэйшую, навучыць і дапамагчы адстаючым.

Тав. ТУФАР.

Тры гады мая брыгада ўсё перавыконвае заданне па сплаву лесаматэрыялаў. У брыгадзе 42 чалавекі. Няма такога сплаўшчыка, які-б не атрымаў прэмію. У мінулым годзе нас прэміравалі **1.000 руб.**

У гэтым годзе мы павінны былі сплавіць да 15 кастрычніка **38 тысяч** кубаметраў будаўнічых матэрыялаў і **43 раўметры** дроў. Гэта заданне наша брыгада выканала датэрмінова.

Мы ганарымся тым, што наша брыгада займае адно з першых месц не толькі ў БССР, але і ў Саюзе. Мяне ў мінулым годзе на ўсесаюзным злёце сплаўшчыкаў у Архангельску прэміравалі касцюмам і ганаровай граматай ударніка. Я задаволен тым, што дабіўся права, каб маё імя была занесена на ўсесаюзную дошку гонару.

У чым сакрэт нашых поспехаў? Справа выканання планаў перш за ўсё залежыць ад саміх людзей, якія працуюць у брыгадзе. Па сканчэнню сплаўных работ людзі маёй брыгады разыходзяцца па іншых работах на зімовы сезон. Я іду працаваць у Ушацкі леспрамгас.

Працуючы ў леспрамгасе, я ні на мінуту не забываю аб сплаве. У мяне ёсць адрасы ўсіх маіх сплаўшчыкаў. Я з імі трымаю пісьмовую сувязь, блізкіх наведваю ў вольны час. І гэта дае мне магчымасць ведаць—прыдзе да мяне той ці іншы сплаўшчык працаваць з пачаткам навігацыі.

Мы выканалі сваё заданне. Цяпер мая брыгада прыступіла да ачысткі рэчкі ад травы. Гэту справу мы робім звычайнай касой. Звязваем па некалькі бярвенняў на іх становяцца ўдзельнікі брыгады і выкошваюць траву на рацэ.

У нас толькі малявы сплаў. Гонім мы не сплочаны лес, а па аднаму бервяну. У нашай рабоце шмат перашкод. Перашкаджае не толькі трава, але і вецер, згібы на рацэ. Мы скасілі траву, перамаглі стыхію, папраўляем згібы берагоў.

У красавіку і маі вятры перашкаджалі сплаўляць лес. Тады мы перайшлі на начную работу. Ноччу звычайна сціхае вецер. Згібы берагоў, мы папраўлялі наступным чынам: абкладаем крутыя і загнутыя берагі бярвеннямі па ступенчатаму прынцыпу. Такім чынам бярвенні, якія мы гонім па рацэ, слізгаюць па ступеньках, адштурхоўваюцца і плывуць далей.

Наша брыгада разбіта на звенні, назначаны звеннявыя. Кожнае звяно адказвае за чыстату рэчкі і даручаную яму работу на ўчастку.

Я павінен адзначыць вялікую ролю, якую адыграла ў барацьбе за выкананне плана наша брыгадная газета. У рэдкалегіі у нас працуюць лепшыя ўдарнікі **Шэндэль Цімох, Глашэвіч Кастусь і Аўдошка Іван.** Газета штодзённа паказвае на сваіх старонках лепшых ударнікаў, метады іх работы і моцна б'е па адстаючых. **Якуб Хадасевіч** дрэнна працаваў. Любіў ён і ўздрымнуць на рабоце. Газета яго дзеянні востра раскрытыкавала і гэта падзейнічала на Якуба. Ён па-сапраўднаму ўзяўся за работу. Цяпер Якуб з'яўляецца адным з лепшых ударнікаў нашай брыгады.

Газета крытыкавала не толькі за дрэнныя адносіны да работы на вытворчасці, але і за невыкананне ўдзельнікамі брыгады сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай. Нядрэнна працуе наш профарганізатар, лепшы сплаўшчык **Іван Бычынскі.** Ён правярае не толькі выкананне дагавароў па соцспаборніцтву, але і ўдзел брыгады у выкананні плана па мясанарыхтоўках. У нас няма такога ўдзельніка брыгады, які-б не выканаў сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай.

Цяпер мяне і загадчыка Ушацкага падучастка Полацкай сплаўканторы—вылучэнца **Кузенца Іосіфа Нісакавіча—па ініцыятыве саюза лесасплаву і газ. «Звязда» накіроўваюць у адстаючы Бярэзінскі сплаўучастак. Мы азнаёмімся там са становішчам рэчкі і румаў. Потым я з сваёй брыгадай паеду на ліквідацыю прарыву і перадам вопыт работы маёй брыгады.**

Брыгадзір Ушацкага падучастка Полацкай сплаўканторы С. Г. ТУФАР.

ХРОНІКА ЗАГАТОЎКІ І ВЫВАЗКІ ЛЕСУ

⊙ **Калгас «Завет Ільіча»** (старшыня Шыдлоўскі), Ліхачоўскага сельсовета, Горацкага раёна, поўнасцю выканаў гадавы план па лесазагатоўках і вывазках. Звыш плана калгас вывез 220 кубаметраў лесаматэрыялаў.

⊙ **Калгас імя Молатава** (Мажараўскі сельсовет, Горацкі раён) поўнасцю выканаў гадавы план па загатоўцы і вывазцы лесаматэрыялаў. Звыш гэтага калгас вывез у другім і трэцім кварталах 110 кубаметраў дроў.

ДА ЎВАГІ ПРАКУРАТУРЫ

ПЕРАХВАТВАЮЦЬ СЕЛЬКОРАЎСКІЯ ПІСЬМЫ

(АГЛЯД ПІСЕМ СЕЛЬКОРАЎ).

У рэдакцыю паступаюць дзесяткі скарг ад нашых селькораў аб тым, што сталі частымі выпадкі ўскрывання пісем. Вось пісьмо селькора-калгасніка **Фекліства** з калгаса **«Прабуджэнне»**, Парыцкага раёна. У гэтым калгасе, як паведамляе селькор Феклістаў, усе пісьмы праходзяць праз рукі старшыні калгаса **Клешчанкі.** Калі, напрыклад, «Звязда» або райгазета «Ленінская перамога» даюць адказы селькорам, дык гэта пісьмо знойдзеш заўсёды разарваным у канцылярыі калгаса.

Характэрны факт. 9 жніўня ў Парычах праводзіўся раённы злёт селькораў, якія пішуць у газету «Звязда». Запрашэнне на гэты злёт атрымаў селькор Феклістаў. Але запрашальны білет селькору ў рукі не трапіў. Пісьмо было ўскрыта Клешчанкам і закінута ў скрынку для смецця. Гэты выпадак не адзіны. Клешчанка разам з пісьманосцам Паважаным Фёдарам пачалі нават нераймаць пісьмы, якія селькоры пасылаюць у рэдакцыю.

У **Прапойскім** раёне, як піша селькор **Зайцаў**, падобнымі справамі займаецца паштовы агент пры Бякцянскім сельсовеце **Смолкіна Б.** Пісьмы селькораў і тут «павінны ў абавязковым парадку» прайсці праз рукі Смолкінай. Усе пісьмы, у якіх селькоры пішуць пра безгаспадарчасць суседняга калгаса, разрываюцца. Няцяжка здагадацца чаму. Старшынёй гэтага калгаса з'яўляецца муж **Смолкінай.**

Больш таго, Смолкіна раскрадае пасылкі. Пасылка чырвонаармейца **Марчанкі А.** на імя яго маткі была ўскрыта і выняты касцюм і боты Смолкіна прысвоіла сабе і аблігацыі дзяржаўных пазык 1932-33 года, на якія падпісваліся калгаснікі.

У Брагінскім раёне падобныя факты прымаюць масавы характар. Селькор **Свірадзенка Андрэй** з Лубініцкага сельсовета піша, што пісьмы, якія пасылае рэдакцыя «Звязды» на яго імя, заўсёды раскрываюцца. Гэта справа паштовага агента **Хвост Васіля.** Гэты агент, як указвае селькор Свірыдзенка, пакоўвае па селькораў кулакоў, якія здзекуюцца над імі.

Гэтыя факты гавораць аб тым што асобныя сельсоветы прытупілі класавую пільнасць, не змагаюцца з класавым ворагам. Факты ў Прапойскага, Парыцкага і Брагінскага раёнаў не з'яўляюцца выпадковымі. Падобныя справы твораць ў радзе другіх месц.

Пракуратура павінна неадкладна заняцца гэтым пытаннем і вінаватых прыцягнуць да самай суровай адказнасці.

ПРЫЕЗД ІТАЛЬЯНСКІХ ПРАФЕСАРАЎ. 8 верасня ў Маскву прыбыла з Італіі група з 28 прафесароў з метай азнаямлення з пастаноўкай у СССР справы барацьбы з туберкулёзам.
НА ЗДЫМКУ: група на чале з прафесарам БОККЕЦІ (у цэнтры, з напісам) на Беларускім вакзале.

НА-ДЗЕЛАВОМУ ПРАВЯДЗЕМ ПАДРЫХТОЎКУ ДА УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЪЕЗДА РАБСЕЛЬКОРАЎ.

РАБСЕЛЬКОРЫ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА КУЛЬТУРНЫ СОВЕЦКІ ГАНДАЛЬ.

БАТАРЭВІЧ — рабкорка рабселькораўскай брыгады імя III Усебеларускага з'езда рабселькораў Менскай шпотачнай фабрыкі імя Крупскай, актыўна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы да з'езда.

У апошніх лічбах ліпеня ў «Звяздзе» быў змешчан матэрыял селькора тав. Бус аб засмечанасці Талачынскага сельпо былымі спекулянтамі і класава-варожымі элементамі. Тав. Бус не супакоіўся толькі тым, што яго матэрыял змешчан а прадаўжаў сачыць за яго дзейснасцю. І сёння ён зноў нам паведамляе, што па ўскрытых фактах не прыняты меры, што загадчык універмага **Сушкін,** старшыня РСС. **Вайнер** павышаюць цэны на тавары, што лепшыя тавары хаваюцца пад прылаўкам і раздаюцца знаёмым, што становішча з вагамі і гірамі не палепшылася. Далей ён паведамляе рэдакцыю, што карэнні нерэагавання — у сямейнасці, зажыме самакрытыкі. Тав Бус прыводзіць прыклад: за тое, што ён выступіў з крытыкай работы каапераціі, намеснік сакратара РК тав. **Вайсброд** выклікаў яго да сябе ў габінет і заявіў, што выступленне некомуністычнае. А ўся «некомуністычнасць» праяўляецца ў тым, што тав. Бус хацеў дапамагчы талачынскай кааператыўнай арганізацыі пазбавіцца ад жулікаў і прахвостаў.

Тав. **Крайко,** селькор Галоцкага сельсовета, Пухавіцкага раёна, увесь час сачыў за работай крам гэтага сельпо. Тав. Крайко піша: «Калі запытаеш прадаўца, ці хутка будуць тавары, дык ён адказвае —не ведаю, старшыня сельпо паехаў у Пухавічы».

Безумоўна, праў селькор, калі ён не задаволіўся такім адказам, а пастараўся ўскрыць прычыну адсутнасці тавараў. Ён выявіў, што старшыня сельпо тав. Міронччык часта ездзіць у Пухавічы, але не для таго, каб прывезці тавары, а каб п'янстваваць. Тав. Міронччык, як правіла, едзе толькі ў тыя сельпо, дзе ёсць гарэлка.

І зусім правільна робіць вывад тав. Крайко, што «такое кіраўніцтва кулацкае, спекулянцкае, бо і сам старшыня Галоцкага сельпо кулак, былы царкоўны староста, абкладаўся цвёрдым заданнем». Рад абураючых фактаў сямейнасці, правалу закупкі хлеба, хабарніцтва, растрат прыводзіць у сваім пісьме тав. Крайко.

«Патрэбна шкодніка і ашуканца выгнаць з хлебапункта».—піша селькор **К.** з вёскі Ляды, Крупскага раёна. У сваім допісе селькор прыводзіць факты, што **Прахарэнка** сістэматычна абважвае здатчыкаў, а потым лішкі збожжа забірае сабе. Так, калгас імя Калініна прывёз на пункт 390 кілг. збожжа, а атрымаў квітанцыю толькі на 332 кілг. Калі-ж калгаснікі, якія прывезлі збожжа запыталіся ў Прахарэнка, ці зыходзіцца іх накладная з квітком, Прахарэнка адказаў, што зыходзіцца. **Селькор, указваючы на ганебныя з'явішчы з боку Прахарэнка, адначасова ўскрывае яго твар.**

Прахарэнка за паўтара года работы старшынёй калгаса «Новы луч» згнаіў больш 1000 пудоў саломы, загнаў жарабца вытворніка і загубіў 7 маладых жарабят. «Зразумела,—піша селькор,—Прахарэнка зноў прымазаўся для таго, каб ашукваць калгаснікаў, і яму не месца ў дзяржаўных установах».

Тав. **Ведаючы** піша: «Я пісаў некалькі заяў аб тым, што загадчык Смалявіцкага пункта Белплодгародніны **Стронччын** сістэматычна купляе розныя промтавары ў магазінах Менска без рахункаў і прадае гэтыя тавары па павышаных цэнах. Апрача гэтага на гэтых пунктах абважваюць спажыўца, і на гэта быў складзен акт, але Стронччын працягвае ашукваць спажыўца. Звяртаўся я ў райвыканком некалькі раз, але РВК ніякіх мер не прымае. **Прашу рэдакцыю газеты «Звязда» дапамагчы мне выгнаць злодзея з кааператыўных арганізацый і пасадзіць яго на лаву падсудных».**

На вялікі жаль, мы яшчэ на сёнешні дзень сустракаемся з фактамі, калі раённыя арганізацыі не падхапляюць сігналаў рабселькораў, не рэагуюць на гэтыя сігналы.

Тое, што асобныя рабселькоры, ускрываючы рад агіднасцей, у тым або іншым раёне, у тым або іншым сельпо, просяць не змяшчаць іх прозвішчаў, а падпісваць псеўданім, яшчэ і яшчэ раз сведчыць аб зажыме самакрытыкі з боку асобных арганізацый, аб адсутнасці масавай работы з рабселькорамі.

Барацьба за совецкі культурны гандаль, за ачышчэнне нашых кааператыўных радоў ад класава-варожых элементаў значна будзе аблегчана, калі ў гэту барацьбу будзе ўцягнута шматтысячная армія рабселькораў, калі на іх сігналы будуць рэагаваць, калі з імі будуць праводзіць адпаведную работу.

РАЗБІЦЬ СЯМЕЙНАСЦЬ І КРУГАВУЮ ПАРУКУ

Цішыня і спакой панавалі ў Сеннёнскай спажывецкай кааперацыі. Спажыўцоў абмервалі, абважвалі, абліччвалі і наогул рабілі з імі што хацелі. І зараз, калі прыглядзешся да работы сеннёнскіх гандлюючых арганізацый, дык складаецца ўражанне, што пастанову ЦК КП(б)Б аб барацьбе з абмерваннем і абважваннем і парушэннем совецкай палітыкі цэн там зусім не чыталі.

Прывядзем некалькі прыкладаў. Перад намі вагі сталоўкі партыйнага актыва. Адна талерка важыць менш другой на 10 грам. Ці не ясна якую выгаду ад гэтага атрымлівала буфетчыца **Бярнацкая.**

У зачыненым размеркавальніку ашукванне спажыўца пастаўлена на больш шырокую нагу. Тут вагі разыходзяцца «толькі» на 4 грамы, але гэты прабел кампенсуецца тым, што гіры падпілены на 8 грам. Падлічана, што ад усяго гэтага прадаўшчыца **Шор** (да рэчы, член партыі) атрымлівала штодзённа толькі аднаго хлеба 12,5 кілограма, не лічачы іншых тавараў.

Але лепш за ўсіх прыстасавалася ашукваць спажыўца прадаўшчыца галантарэйнага аддзела універмага **Цыганкова.** У яе няма вагаў, гір. Абмерваннем і абважваннем займаюцца ў іншых аддзяленнях універмага, а Цыганкова толькі сістэматычна абліччвае пакупнікоў. Метр шнуру каштуе 27 кап., а Цыганкова прадае яго за 40 к. На гузіках Цыганкова таксама ўхітрылася абжульваць пакупнікоў. Гузік каштуе 2 кап., а Цыганкова бярэ 7 кап. Пры гэтым трэба ўлічыць, што касы ва ўнівермагу няма, і грошы за прададзены тавар атрымлівае сама Цыганкова.

Прыведзеныя намі прыклады выкрыты брыгадай друку, але нідзе гэтыя факты не абмяркоўваліся. Райком партыі лічыць, што гэта дробязі. Пракурор **Хількевіч** таксама лічыць гэта дробязю і вельмі неахвотна ўзяўся за гэту справу. Метады яго работы выклікаюць па меншай меры здзіўленне. Гэты пракурор (аб ім і аб яго метадах ужо пісала «Звязда») перш за ўсё прыцягнуў да допыту брыгадзіраў, хоць у яго ёсць пісьмовы матэрыял і матэрыялы раённай газеты «Комунар». Выходзячы з габінета Хількевіча, брыгадзіры—у сваёй большасці кааператыўныя работнікі-актывісты—зарокліся ніколі не крытыкаваць, бо адчулі на сабе ўсе вынікі гэтай крытыкі.

Яшчэ трэба дадаць, што ўдзельнікаў рэйда пачалі адкрыта цкаваць жулікі і іх мужы, якіх брыгадзіры выкрылі. Цкаванне будзе яшчэ больш зразумела, калі дадаць, што Цыганкова—жонка памочніка ваеннага камісара, што член партыі Шор—жонка ўчаст. інспектара міліцыі па мястэчку.

Наогул трэба адзначыць, што ў раёне пануе кругавая парука. «Не чапай мяне і я цябе чапаць не буду»—вось лозунг Цыганковых, Шор, Хількевіча і ім падобных. Таму справа аб злоўжываннях у сеннёнскай кааперацыі фактычна замята, змазана.

Трэба, каб у гэту справу ўмяшалася пракуратура рэспублікі. Трэба, каб Бернацкая, Шор, Цыганкова і іх абаронцы, у тым ліку пракурор Хількевіч, атрымалі па заслугах.

В. МУХІН.

ЗА ШКОЛУ, ВАРТУЮ НАШАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЭПОХІ

⊙ ⊙ ⊙

А. ЧАРНУШЭВІЧ,
наркомасветы БССР

У мінулым 1933-34 годзе школы Беларусі, змагаючыся за рэалізацыю рашэнняў партыі і ўрада, дабіліся ў радзе важнейшых галін школьнай работы прыкметных паляпшэнняў.

Школы, як правіла, працавалі па адзіных праграмах і падручніках, на аснове ўмацаванага школьнага рэжыму і безумоўна павысіўшайся дысцыпліны ў школе. Урок стаў адзінай абавязковай формай навучання на аснове цвёрдага раскладу. Настаўнік больш энергічна рыхтаваўся да ўрока, імкнучыся аснасціць яго неабходным дыдактычным матэрыялам, больш энергічна ўзяўся за павышэнне сваёй кваліфікацыі. Выраслі дзесяткі і сотні сапраўдных майстроў педагагічнага працэса, сапраўдных ударнікаў і энтузіястаў совецкай школы.

У рэзультаце мы маем рост паспяховасці і ведаў вучняў. Агульны процант паспяховасці па БССР падняўся да 92. Гэта нас абсалютна не задавальняе, але ўсё-ж сведчыць аб няўхільным прасоўванні наперад у частцы ліквідацыі «карэннага недахопу» школы. Мінулы навучальны год пры павышанай патрабоўнасці з боку настаўніка да ведаў вучняў характэрны зніжэннем другагодніцтва. Найбольш прыемнай з'явай трэба лічыць павелічэнне колькасці вучняў, абсалютна паспяваючых па ўсіх прадметах. Ёсць зрух і ў барацьбе за граматнасць вучняў. Мабілізацыя ўвагі настаўніцтва вакол гэтых пытанняў дала свае станоўчыя рэзультаты, хоць далёка яшчэ нездавальняючыя.

Увесь гэты працэс праходзіў на фоне ўзрослай матэрыяльнай базы школы—у мінулым годзе ўступіла ў строй 206 школьных будынкаў, было прыстасавана пад школы каля 500 былых кулацкіх дамоў, фонд прышкольных участкаў узрос з 2 да 18 тыс. гектараў, з якіх знят нядрэнны ўраджай.

Аднак, поспехі школ Беларусі яшчэ вельмі недастатковы. Трэба прама сказаць, што работа школы паляпшаецца недапушчальна павольна і ў радзе выпадкаў у яўнай неадпаведнасці з узрослай матэрыяльнай базай.

Мы яшчэ слаба ўяўляем сабе сапраўднае становішча, патрэбы і запросы школ. Мы з вялікім спазненнем вывучаем асобныя працэсы, якія адбываюцца ў школе. Многія аддзелы народнай асветы Беларусі часта не ведаюць сапраўднай якасці настаўнікаў і вучняў, не ведаюць жывых людзей, рэдка заглядваюць у школу, мала аддаючы ўвагі цэнтральнай фігуры школы—настаўніку. Гэта-ж факт, што многія раёна проста крычаць і бамбардыруюць Наркомасветы аб недахвацце настаўнікаў і ў той-жа час агідна выкарыстоўваюць наяўныя кадры.

У Камарынскім раёне «клопаты» аб настаўніку, аб замацаванні яго на рабоце праявіліся ў «планаванні» перакідкі каля 80 настаўнікаў раёна.

У Касцюковіцкім раёне «гора-кіраўнікі» задумалі перакінуць 50 проц. настаўніцкага складу.

Няммала было фактаў і другіх парушэнняў матэрыяльна-прававога становішча настаўніцтва. Даволі ўказаць хоць-бы на тое, што патрабавалася рашучае ўмяшанне ЦК КП(б)Б, СНК БССР і ўпаўнаважанага Камісіі совецкага кантроля, каб прымусіць рад раёнаў ліквідаваць запазычанасць па зарплаце настаўнікаў

З усёй рэзкасцю трэба падкрэсліць безадказныя адносіны раду раёна (Лельчыцы, Чашнікі, Гомель, Магілеў, Менск, Крупкі і інш.) да павышэння кваліфікацыі настаўніцтва. Гэтыя раёны не толькі сарвалі пасылку настаўнікаў на кароткатэрміновыя курсы, але нічога не зрабілі і для ахопу малакваліфікаваных настаўнікаў завочным навучаннем.

Мы маем таксама недапушчальнае адставанне ў асваенні праграмнага матэрыяла, асабліва адчувальнае ў галіне мовы, літаратуры, гісторыі і геаграфіі. Граматнасць, культура пісьма і мовы вучняў—усё яшчэ слабае звяно нашай школы.

**

Майскія пастановы ЦК і СНК Саюза аб школе—ёсць канкрэтная праграма, указваючая шлях усёй арганізацыйнай перабудовы школы і органаў Наркомасветы. Яны нанеслі рашучы ўдар «левацкім» пражэктёрам, цягнуўшым школу на шлях выхавання бязграматных маньекаў замест патрэбных краіне будаўнікоў соцыялізма, усебакова развітых і культурных.

Няммерна вырасла ўвага да совецкай школы, выраслі клопаты аб школе, аб яе патрэбах.

Узор бальшавіцкіх клопатаў аб школе паказваюць перадавікі-шэфы: менскі машынабудаўнічы завод імя Варашылава, менскі Эльвод, Бабруйскі лясны камбінат і інш. Падшэфныя гэтым прадпрыемствам школы к 15 жніўня былі не толькі адрамантаваны, але і даабсталяваны палітэхнічнымі, нагляднымі і іншымі дапаможнікамі, забяспечаны базай для гарачых снеданняў. На гэтых прадпрыемствах клопаты аб школе і дапамога ёй сталі штодзённай справай лепшых ударнікаў.

Конкурс, праведзены ЦВК БССР ўцягнуў сотні сельсоветаў у канкрэтныя клопаты аб падрыхтоўцы да навучальнага года. Нельга не сказаць аб такіх перадавіках у гэтай вялікай справе, як Ярэмкаўскі сельсовет, Аршанскага раёна (старшыня т. Мяжуеў), Меркулаўскі сельсовет, Рагачоўскага раёна і рад іншых. У гэтых сельсоветах была датэрмінова закончана ўся падрыхтоўчая работа.

Прыкладам умення па-бальшавіцку весці падрыхтоўку школ да навучальнага года могуць служыць многія дырэктары і загадчыкі школамі, якія павінны быць сёння раўнаваннем з перадавымі шэфамі, сельсоветамі і раёнамі вядомы краіне. Гэта —тав. **Дзятко**—дырэктар 13-й менскай школы, т. **Ярэменка**—дырэктар асіпавіцкай школы, т. **Асташкевіч**—дырэктар рагачоўскай 4-й школы, т. **Ціханаў**—дырэктар віцебскай 22-й чыгуначнай школы, т. **Шынгароў** — дырэктар гамарынскай школы, тав. **Шылінгоўскі**—дырэктар брагінскай школы, т. **Кандыбовіч**—дырэктар віцебскага дапаможнага інстытута і рад іншых.

Папярэднія вынікі падрыхтоўкі да новага навучальнага года паказваюць, што **Полацкі, Клімавіцкі, Рагачоўскі і Слуцкі** раёны з'яўляюцца перадавымі ў падрыхтоўцы школ да вучобы. Добрыя паказальнікі маюць **Менск** (горад), **Віцебскі, Аршанскі** і некаторыя іншыя раёны. Тут школьнікі ў першы дзень заняткаў знайшлі добра адрамантаванае памяшканне і мэблю, дастатковую колькасць падручнікаў і пісьмовых прылад, гарачыя, сытныя снеданні і падрыхтаванага да работы педагога. Поспехі гэтых раёнаў з'яўляюцца рэзультатам вялікай увагі і аператыўнай дапамогі школе мясцовых партыйных і совецкіх органаў.

**

У гэтым годзе больш арганізавана разгорнута работа па выданню і прасоўванню ў школу падручніка. К 1 верасня ў раёны завезена на 3 млн. руб. падручнікаў. Аднак, трэба адзначыць, што некаторыя падручнікі выданы з тэхнічнымі памылкамі, дрэннымі малюнкамі (лемантар Сіўко, руская хрэстаматыя Каркадыноўскай, граматыка Вяліосіка і Севернёвай). ДВБ зацягнуў давыданне асобных падручнікаў, выпушчаных няпоўнымі тыражамі.

Ужо зараз выявіўся прарыў у забеспячэнні падручнікамі вельмі вырасшых 8, 9 і 10 класаў. Выданая ў мінулым годзе частка падручнікаў для гэтых класаў была разбазарана і зараз прыходзіцца прыступіць к дадатковаму выданню іх.

Кепскае пакуль што становішча з завозам і выданнем падручнікаў у БССР для нацменаўскіх школ (польскіх, украінскіх, яўрэйскіх і інш.). Зацяжка выдання гэтых падручнікаў, безумоўна, тармозіць нармальны ход заняткаў у нацменаўскіх школах.

Рост сеткі школ прадвызначыў вялікі размах у справе падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў. Кароткатэрміновыя курсы летам падрыхтавалі 2500 настаўнікаў для пачатковай школы. Праз летнія курсы перападрыхтоўкі павысіла сваю кваліфікацыю 1105 настаўнікаў. Гэтыя настаўнікі пераведзены на работу ў старшых класах. Былі створаны спецыяльныя курсы для перападрыхтоўкі выкладчыкаў гісторыі і геаграфіі. 100 лепшых настаўнікаў-ударнікаў былі адпраўлены ў экскурсіі па СССР.

Усе гэтыя мерапрыемствы, уключаючы і завочнае навучанне, да рэчы, пастаўленае пакуль што нездавальняюча, не змаглі канчаткова вырашыць праблему кадраў для бягучага навучальнага года. К пачатку навучальнага года не хапала 320 настаўнікаў, галоўным чынам славеснікаў і гісторыкаў.

**

Гэты год павінен быць апошнім і рашаючым у справе ліквідацыі «карэннага недахопу». Няма і не можа быць ніякіх апраўдваючых «аб'ектыўных» прычын для дрэннай работы школ.

Перад кожным работнікам народнай асветы зверху данізу стаіць задача — канчатковая перайсці ад агульнага і адцягненага да канкрэтнага і аператыўнага кіраўніцтва, утрунтаванага на дэтальным вывучэнні і канкрэтным веданні справы. Ад нас патрабуецца ўзмацненне асабістай адказнасці. Кожны дырэктар, кожны педагог павінен гэта зразумець.

Дырэктар і загадчык школай павінны стаць такой-жа ганаровай фігурай, як і дырэктар прадпрыемства.

Совецкі настаўнік з'яўляецца цэнтральнай фігурай педагагічнага працэса. Ён павінен, выкарыстоўваючы ўсю паўнату сваіх правоў і абавязкаў, з поўным усведамленнем сваёй адказнасці, узяцца па-ўдарнаму за якаснае паляпшэнне выкладання, за комуністычнае выхаванне дзетвары.

Совецкі педагог павінен быць акружан штодзённымі клопатамі і ўвагай з боку ўсёй нашай грамадскасці. Не павінна быць месца агідным фактам у адносінах да настаўніка, якія былі ў Лёзненскім, Плешчаніцкім, Бабруйскім і інш. раёнах.

Асаблівую ўвагу ўсяго настаўніцтва, Наркомасветы і яго органаў павінна прыцягнуць выкладанне мовы, літаратуры, гісторыі і геаграфіі. У гэтым годзе трэба рашуча ліквідаваць недапушчальнае адставанне і скажэнні, меўшыя месца ў выкладанні гэтых важнейшых дысцыплін.

Высокаякаснае і поўнае выкананне навучальных праграм па кожнаму прадмету з'яўляецца дзяржаўным абавязкам кожнага дырэктара, кожнага педагога. Кожны дырэктар школы і настаўнік павінны зразумець, што якаснае і поўнае выкананне праграмы роўнаважна выкананню промфінплана і з'яўляецца дзяржаўнай справай, чэсным выкананне якой ператвараецца ў дзяржаўнае злачынства.

Мінулы навучальны год характэрны з пункту гледжання пераключэння Наркомасветы на жывую сувязь з асобнымі школамі, настаўнікамі. Гэта сувязь павінна быць замацавана ў бягучым навучальным годзе. У Наркомасветы паступае кожны дзень шмат заяў ад настаўнікаў, кіраўнікоў школ, у якіх яны пішуць аб сваіх патрэбах. Гэта нядрэнна. Але, на жаль, да гэтага часу мала было такіх фактаў, калі-б дырэктар школы, настаўнік ставіў-бы перад Наркомасветы пытанні вытворчага парадку: аб праграме, аб падручніку, аб метадыцы, аб выхаваўчай рабоце. Наркомасветы ў гэтым годзе рашыў выдаваць бюлетэнь з тым, каб кожная школа і кожны настаўнік меў магчымасць арыентавацца ў бягучых пытаннях школьнай палітыкі і практыкі.

**

Высока трымаючы сцяг пралетарскага інтэрнацыяналізма, рашуча змагаючыся са спробамі нацдэмаўскага ахвосця і другіх класавых ворагаў выкарыстаць школу ў сваіх мэтах, перамагаючы супраціўленне класавага ворага далейшаму ажыццяўленню ленінскай нацыянальнай палітыкі ў школе, совецкае настаўніцтва Беларусі пад кіраўніцтвам КП(б)Б абавязана рэалізаваць і рэалізуе гістарычнае рашэнне партыі і ўрада аб пабудове сапраўднай школы Маркса-Леніна-Сталіна, вартай сваёй вялікай соцыялістычнай радзімы.

Чырвонасцяжнае настаўніцтва БССР павінна па-бальшавіцку змагацца на культурным фронце за высокае права ўзнагароды Беларусі ордэнам Леніна не толькі ў галіне эканомікі, але і культуры.

ЧАМУ НЯМА ПРЫЛІВУ Ў КАЛГАС „НОВЫЯ ШЫЧЫ“

Ніжэй ідзе гутарка аб кіраўніку калгаса, які лічыць сябе вялікім начальнікам і адміністратарам. Калгаснікі для яго—ГЭТА ЛЮДЗІ БЕЗ ПРАЎ. Ён не гаворыць з імі, не ўлічвае іх настрояў, не лічыцца з іх думкамі і прапановамі. Стыль работы гэтага кіраўніка — ГРУБЫ ВОКРЫК І ЗАПАЛОХВАННЕ. Прозвішча гэтага «ўнцера» ад кіраўніцтва КРЭК Н.

Аб чым гэта гаворыць? АБ ТЫМ, ШТО НА МАЗЫРШЧЫНЕ ПАДБОРАМ КАДРАЎ ДЛЯ КАЛГАСАЎ ЗАЙМАЮЦЦА ДРЭННА І ПАВЯРХОЎНА, АБ ТЫМ, ШТО МЕТАДЫ, ЯКІМІ КІРАВАЎ КАЛГАСАМ КРЭК, НЕ ЗАЎСЁДЫ СУСТРАКАЮЦЬ АСУДЖЭННЕ З БОКУ РАЁННЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ. НААДВАРОТ, ЧАСАМІ ГЭТЫМ МЕТАДАМ ПАТУРАЮЦЬ.

На самой справе. Палітаддзел МТС Крэка знімае з работы ў калгасе, як «левака», грубага адміністратара, а РВК, трэба думаць, не без ведама і згоды райкома, пасылае гэтага самадура на яшчэ большую пасаду—старшынёй сельсовета. І апраўдваецца гэта такім матывам: у сельсовеце патрэбны адміністратары!

Ці-ж гэта не сведка патурання з боку райарганізацый работнікам, падобным Крэку? Вымераць здольнасць і якасць работніка ўменнем толькі адміністраваць—ШКОДНА І НЯПРАВІЛЬНА.

СКРОМНАСЦЬ, ЧУЛАСЦЬ ДА ЖЫВЫХ ЛЮДЗЕЙ, ПАЧУЦЦЁ АДКАЗНАСЦІ ЗА КОЖНЫ СВОЙ КРОК ПЕРАД МАСАЙ, ПАЛІТЫЧНАЯ ЗОРКАСЦЬ—такавы патрабаванні да работнікаў-большэвікоў.

Калгасам і сельсоветам патрэбны аўтарытэтныя кіраўнікі, масавікі, арганізатары, людзі, якія сваімі дзеяннямі натхнялі-б калгаснікаў да работы, выклікалі ініцыятыву, узнімалі дух, а не «ўнцеры» і адміністратары.

Рэдакцыя чакае ад мазырскага РК КП(б)Б прыняцця мер па фактах, узнятых пісьмом групы комсамольцаў і артыкулам нашага карэспандэнта. СІГНАЛ З МАЗЫРА ПАВІНЕН БЫЦЬ УЛІЧАН І ЎСІМІ АСТАТНІМІ РАЁНАМІ БЕЛАРУСІ.

(ПІСЬМО КОМСАМОЛЬЦАЎ)

Прыклад няўмелага кіраўніцтва паказвае старшыня калгаса «Новыя Шыччы», Мазырскага раёна, комуніст **Крэк.** Улюбёны метад кіраўніцтва Крэка—голае адміністраванне. У калгасніка Канавала Трахіма Крэк узяў пчолы, а за процідзеянне гэтаму выключыў яго з калгаса. У калгасніка **Кулчына** была абагулена хата. Гэтыя перагібы былі выпраўлены палітаддзелам МТС. Крэк групамі выключаў з калгаса. **Амяльян Чарняўскі** быў выключан за тое, што не закантрактаваў цяля; **Амяльян Прыхоцька** за тое, што на сваім агародзе засеяў 0,04 га збожжа. Выключаны таксама Палазнік Сідар і іншыя. Аб усіх гэтых выключэннях не паведамілі на агульным сходзе калгаса. Крэк усіх калгаснікаў называе кулакамі і пагражае выключэннем з калгаса і штрафамі.

Прыліву ў калгас няма. Аднаасобнікі, бачачы адносіны Крэка да калгаснікаў, баяцца ісці ў калгас. Але не ўсім Крэк страшны. Лекару-шаптуну **Амяльяну Курылу,** напрыклад, ён лепшы прыяцель і таварыш. Ён яму змяніў калгасную карову без ведама і згоды праўлення. Абышоўшы комсамольскую арганізацыю, палітаддзел і праўленне калгаса, Крэк сам знімае з работы загадчыка МТКФ комсамольца **Муліца** за тое, што ён пісаў аб ім у газету.

Комсамольцы: К. ПАЛАЗНІК, У. УЛАСЕНКА, А. МІНЕВІЧ.

* *
*

МОЗЫР. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

Калі комуніста **Н. Крэка** выбралі старшынёй калгаса, асобныя калгаснікі гаварылі:

— Зараз у нас справа паладзіцца, ён-жа комуніст.

Памыліліся калгаснікі. Крэк аказаўся дрэнным комуністам. За 6 месяцаў работы старшынёй калгаса ён паказаў сябе не кіраўніком гаспадаркі, а «грозным начальнікам». Для Крэка калгаснікі—гэта людзі без праў. З імі можна рабіць абы што. Праўленне калгаса Крэк збірае толькі ў «выключных» выпадках.

У Крэка з'явіўся нядрэнны намер—завесці ў калгасе пчалаводную гаспадарку. Але дзе ўзяць пчол? Добры гаспадарнік у такіх выпадках прыбягае да гаспадарчага абароту: за лік даходу ад адной галіны гаспадаркі развівае другую. Але на што ламаць галаву Крэку? У яго зусім іншы абарот. Ён, як «грозны начальнік», для якога не пісаны законы, выдае загад, каб усе калгаснікі, маючыя пчол, абагулілі іх. І калі гэты галавацяпскі загад не выконваўся, Крэк запрагае коней і сілком забірае ў калгасніка Трафіма Канавалава некалькі сямей пчол, а самога за невыкананне загада выключае з калгаса. Такую-ж «аперацыю» Крэк прарабіў і з калгаснікам **Амяльянам Чарняўскім.** Апошні выключан з калгаса за тое, што не закантрактаваў цялё. Калгаснік **Амяльян Прыходзька** таксама выключан з калгаса за адмаўленне абмяняць сядзібу з аднаасобнікам.

Усе гэтыя выключэнні праведзены Крэкам асабіста, без абгаварэння на праўленні, не гаворачы ужо аб зацвярджэнні агульным сходам.

Бачачы такое голае адміністраванне і камандаванне комуніста-парторга калгаса, комсамольцы пачалі крытыкаваць і асуджаць дзеянні Крэка. У адказ на гэта Крэк прыбегнуў да «контратакі». Перш за ўсё ён абрушыўся на комсамольца—загадчыка МТФ т. **С. Муліца.** Без усякіх падстаў ён зняў яго з работы. Гэты факт выклікаў абурэнне калгаснікаў. Комсамольцы сабралі сход і папрасілі Крэка сказаць аб прычыне зняцця Муліца з работы. Двойчы Крэк на сход не прышоў.

У трэці раз прышоў і заявіў:

— Ведаю за што зняў Муліца з работы, а ваша справа, малакасосы,—у мае функцыі не ўмешвацца.

Так парторг «кіруе» комсамольцамі. Так ён кіруе і калгаснікамі. Крэк адарваўся ад мас, забыў, што калгаснікі з'яўляюцца гаспадарамі калгаса, а ён іх кіраўніком.

Пасля гэтага няма чаго дзівіцца, што у калгас зусім не было прыліву. Аб фактах голага адміністравання і камандавання калгаснікамі з боку Крэка ведаў палітаддзел Дамановіцкай МТС, але палітычнага значэння ім спачатку не надаваў. І толькі пасля таго, як комсамольцы падалі калектыўную заяву, на месца выехаў памочнік начальніка палітаддзела т. **Трушык** і прышоў да вываду, што т. Крэк старшынёй калгаса далей аставацца не можа. Палітаддзел на падставе заявы тав. Трушыка рашыў наогул не дапускаць т. Крэка да кіруючай работы ў калгасе.

Для самадура, голага адміністратара Крэка знайшлі больш прытульны куток—сельсовет. Там, моў, патрэбны адміністратары. Месяц назад РВК прызначыў Крэка старшынёй Дудзіцкага сельсовета. Але ўжо тут ён паспеў паказаць сябе «грозным начальнікам». Каб дастаць добрую кватэру, Крэк загадаў мясцоваму паштоваму агенцтву аслабаніць памяшканне. І калі галавацяпскі загад не быў выканан, Крэк узламаў замок, уварваўся у агенцтва, павыкідаў адтуль усе паштовыя справы, нават грашовыя пераводы і заняў памяшканне.

Наўрад ці трэба даказваць, што такі тып «комуніста» без мас, «комуніста»-голага адміністратара, «комуніста»-«грознага начальніка» апрача шкоды нічога партыі не прынясе.

П. ФРАЛОЎ.

ДА УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЛЁТА ПРАДСТАЎНІКОЎ ЛЕПШЫХ ЖЫВЁЛАГАДОЎЧЫХ ФЕРМ

Сустрэць раённыя злёты работнікаў жывёлагадоўчых ферм поўнай гатоўнасцю да зімоўкі жывёлы

УКЛЮЧАЕМСЯ Ў АГЛЯД

Уважліва прачыталі мы пісьмо калгаснікаў з «Чырвоных усходаў», Аршанскага раёна, аб барацьбе за далейшае разгортванне жывёлагадоўлі. Правільна, падрыхтаваць сытую зімоўку для калгаснай жывёлы вельмі адказная задача.

Мы вітаем вашу ініцыятыву і ўключаемся ў конкурс па падрыхтоўцы жывёлагадоўчых ферм да зімы. Правільна і тое, што асноўным зместам падрыхтоўкі ферм да зімы з'яўляецца кармовая база.

Ганьба і сорам тым калгасам, якія сёлета не забяспечаць сваю жывёлу кармамі. **Яшчэ не было ў нас такога спрыяючага года для загатоўкі кармоў як сёлета.** Вазьміце толькі адно надвор'е, якое так спрые загатоўцы сена, сіласу. А сёлета ўраджай значна вышэйшы, чым у мінулы год. К прыкладу, па нашаму калгасу «Шлях соцыялізма» (Барысаўшчына) ўраджай зернавых з гектара ў гэтым годзе на 2 цэнт. вышэй мінулага года, ураджай бульбы—вышэй у два разы. Ды не толькі ў нас, а па ўсёй БССР.

Усё гэта, падкрэсліваем яшчэ раз, дае магчымасць загатовіць для жывёлы даволі каштоўнага корму.

Наша малочная ферма мае 80 галоў буйнай рагатай жывёлы, у тым ліку 40 дойных кароў.

З чым мы сустракаем надыходзячую зіму? Адказваем:

1. Знялі падвойны ўкос з 130 гектараў сенажаці. Сабралі каля 15 тыс. пудоў першакласнага сена, накасілі 6 тыс. пудоў высокакласнай канюшыны. Гэта дазваляе нам даць на кожную галаву буйнай рагатай жывёлы 25 цэнт. сена-канюшыны.

2. На кожную галаву мы вызначаем 3 цэнт. канцэнтратаў і 10 цэнт. бульбы.

3. Загатовілі 80 тон сіласу з капуснага лісця і зялёнага бульбоўніку. Такі сілас заменіць нашым каровам свежа-сакавітую траву, якую маюць летам на пашы. На адну галаву прыходзіцца па 2 тоны сіласу.

Пра салому мы не гаворым. Яе наша жывёла будзе атрымліваць без абмежавання.

Жывёла калгаснікаў таксама забяспечана не горш.

На адзін працадзень прыпадае 4 кгр. зярна, 12 кгр. бульбы, 6 кгр. грубых кармоў, а калі прыняць пад увагу, што сярэдні заработак складае 400 працадзён, то стане ясным, што жывёла калгаснікаў будзе карміцца нядрэнна.

Кароўнік у нас новы, светлы і цёплы. Зараз робім новыя дадзія кармушкі. Для цялят рыхтуем асобнае памяшканне. Усё гэта к таму, каб да зімы не зніжаўся ўдой. Вось шлях да яшчэ большага росту прадукцыйнасці нашай малочнай фермы, якая і зараз з'яўляецца адной з галоўных таварных галін нашай гаспадаркі.

Калгаснікі, працуючыя на ферме калгаса «Шлях соцыялізма», Барысаўскага раёна

РОЎБА, РОЎБА М., ГАЙЧОНАК, ДАКУКА.

„МЕНШАЕ ЗЛО“

Калгасы **Чэрыкаўскага** раёна дабіліся значных поспехаў у барацьбе за стварэнне моцнай кармовай базы для жывёлы. Перавыканан план сіласавання, паспяхова завяршаецца другі ўкос сена.

Але наўрад ці трэба даказваць, што падрыхтоўка да зімоўкі жывёлы не вычэрпваецца толькі складаннем кармовай базы. Не меншую ролю тут адыгрывае падрыхтоўка памяшканняў для жывёлы.

Але аб гэтым у Чэрыкаўскім раёне забылі. Паводле плана райзёмаддзела ў калгасах у гэтым годзе павінна быць пабудавана 11 кароўнікаў і 44 канюшні.

Фактычна пачата будаўніцтва толькі 15 канюшань, з 11 кароўнікаў пачата будаўніцтва толькі 5, прычым размеры праведзеных работ не перавышаюць 20—25 проц. У яшчэ больш пагражаючым становішчы будаўніцтва пачатых свінарнікаў.

У калгасе «12-годдзе Октября», Верамееўскага сельсовета, ужо скора 4 гады «будуюць» свінарнік. Свінні ў гэтым калгасе размешчаны на чатырох цёмных, брудных, непрыстасаваных будынках.

Між тым старшыня калгаса Сцепаненка лічыць, што ў яго «ёсць больш важныя справы, чым будаўніцтва свінарніка».

У калгасах «Шосты з'езд советаў», імя Максіма Горкага, Рыкаўскага сельсовета; імя Варашылава і імя Будзённага, Каменскага с.-совета, дзе па плану намечана пабудова свінарнікаў, будаўніцтва яшчэ не распачата.

Па матэрыялах райзямаддзела лічыцца, што будаўніцтва 11 кароўнікаў хутка будзе скончана. Па гэтых-жа матэрыялах напрыклад, лічыцца, што кароўнік калгаса «Чырвоны пераможнік», Зябенскага сельсовета, амаль пабудован, а ў сапраўднасці-ж гэты кароўнік яшчэ не накрыт і для ўнутранага абсталявання кароўнік не падрыхтован. Так выглядваюць «амаль гатовыя», па матэрыялах райзямаддзела, кароўнікі і ў многіх іншых калгасах.

Безумоўна, праў нам. начальніка райза т. Букачоў, што значная частка старшынь калгасаў не цікавіцца будаўніцтвам. Гэта-ж факт, што стары вопытны загадчык буйнай свінафермы калгаса «Шлях да соцыялізма» тав. **Доракаў,** адчуваючы набліжэнне восені, абівае парогі раённых арганізацый, у тым ліку і райза, са скаргамі на старшыню калгаса, які не выдзяляе калгаснікаў для скончэння будаўніцтва свінарніка.

Аднак, нельга прайсці міма фактаў бяздзейнасці саміх кіраўнікоў райза, якія цалкам даверылі гэту важнейшую справу старшыням калгасаў і самі нават не ведаюць, у якім становішчы знаходзіцца будаўніцтва.

Некалькі слоў аб будаўніцтве канюшань.

У мінулую зіму калгасы Чэрыкаўшчыны панеслі вялікія страты конскага пагалоўя. Колькасць паўшых коней у раёне складае 250 галоў. Між тым, у райза лічаць недапушчальна марудлае будаўніцтва канюшань «меншым злом».

СТАЛЬ.

БУДАЎНІЦТВА АБОР І СВІНАРНІКУ—ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ

ЧЫРВОНАПОЛЛЕ. (Ад карэспандэнта «Звязды»).

У большасці калгасаў зімой жывёла стаіць у так званых «хлявушках».

У гэтым годзе большасць калгасаў пачалі будаваць аборы для кароў, канюшні, свінарнікі. Аднак, будаўніцтва праходзіць вельмі марудна. Пры такіх тэмпах ні ў якім разе яно не будзе скончана да пачатку стойлавага перыяда.

Многія скардзяцца: «Не будуем таму, што нехапае цвікоў, шкла». Але асобныя калгасы раёна паказваюць прыклады як можна будаваць добрыя свінарнікі, канюшні, кароўнікі, мабілізуючы ўласныя рэсурсы.

Вось калгас імя Валадарскага (старшыня **Аляксеенка).** За гэты год у калгасе пабудован кароўнік на 100 галоў і дзве канюшні. Апрача таго пабудаваны яшчэ аўчарнік, цялятнік і два паграбы. Уся жывёла ў калгасе будзе стаяць у адным месцы, і на гэтым калгас з'эканоміць многа кармоў, якія-б расцягнулі па хлявушках.

У калгасе «Рассвет» (старшыня **Небажаткін)** таксама пабудован добры свінарнік. І знойдзецца яшчэ добры дзесятак такіх калгасаў, дзе ўвесь час працавалі пастаянныя будаўнічыя брыгады, якія забяспечылі выкананне плана будаўніцтва.

Або ўзяць калгас «Комінтэрн», Пачанаўскага сельсовета. Калгасу трэба было за гэты год пабудаваць канюшню. Будаўніцтва яе і не пачыналі. Не прыступалі да будаўніцтва кароўніка і ў калгасе «Савецкая Беларусь», Сабалеўскага сельсовета, свінарніка ў калгасе імя Будзённага, Гарэзінскага сельсовета. А свінні ў гэтым калгасе знаходзяцца ў агідным становішчы, адыход маладняка даходзіць да 30 процантаў. Свінаферма не можа пашырацца і расці, знаходзячыся ў малапрыстасаваным хлеве.

У калгасе «Камбайн» і «Звязда Октября» каровы стаяць на двара. Двары мокрыя, брудныя. Прыстасоўваць кароўнікі тут і не думаюць.

Будаўніцтва па раёну выканана не больш як на 30-40 проц. Райзямаддзел, прытрымліваючыся «чарговасці» кампаній, не даваў указанняў і не кіруе заканчэннем будаўніцтва і падрыхтоўкай ферм да зімы.

М. В.

ПІСЬМЫ рабочых і калгаснікаў

САКРАТАРУ ВІЦЕБСКАГА ГАРКОМА КП(б)Б ТАВ. ЖУРАЎЛЁВУ.

ДЛЯ ФАЙНБЕРГА ЗАКОНЫ НЕ ПІСАНЫ

(ПІСЬМО РАБОЧАГА)

Я, былы рабочы віцебскай фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», у сакавіку 1934 г. быў мабілізован

Віцебскім гаркомам КП(б)Б на работу ў Дрысенскі раён, дзе і зараз працую ў арцелі.

Сям'я мая—жонка (работніца фабрыкі «Профінтэрн») і дзіцё асталіся жыць у Віцебску на кватэры, дзе я раней жыў—па Комсамольскай, 48.

Жонка мая з прычыны хваробы каб паправіць сваё здароўе, выехала часова ў адпачынак да мяне папярэдзіўшы жакт, што пасля адпачынку яна прыедзе зноў.

Не гледзячы на тое, што плата за кватэру ўнесена была і хатнія рэчы асталіся ў кватэры пад замком, 22 жніўня па загаду Горжылсаюза—т. Файнберга замок ад маёй кватэры адарвалі і ўсялілі жыхара.

Спадзяюся, што рэдакцыя дапаможа мне атрымаць сваю ранейшую кватэру, даўшы магчымасць маёй жонцы прыступіць зноў да работы.

КУБЕЛЬ.

АД РЭДАКЦЫІ:

Пісьмо рабочага Кубеля сведчыць аб выключна нячулых і бюракратычных адносінах да яго сям'і з боку Горжылсаюза і яго кіраўніка Файнберга.

«Звязда» спадзяецца, што Віцебскі гарком КП(б)Б ацэніць паводзіны Файнберга і прымусіць яго неадкладна вярнуць сям'і т. Кубеля займаемую ёю раней кватэру, прыцягнуўшы Файнберга да суровай адказнасці.

ГОМЕЛЬСКАМУ ГОРПРАКУРОРУ ТАВ. БУРАКОВУ.

БЮРАКРАТЫЧНЫЯ АДПІСКІ ЗАМЕСТ ДАПАМОГІ

(ПІСЬМО РАБОТНІЦЫ КААПЕРАЦЫІ)

Працую ў Гомельскім ЦРК. У жніўні мінулага года я атрымала адпачынак, у часе якога паехала да сваіх сваякоў у Чарнігаў. Аб гэтым я паведаміла старшыні жакта тав. **Сіроткіну,** унёсшы кватэрную плату да верасня. Вярнуўшыся з адпачынку, я знайшла ў сваёй кватэры сям'ю грамадзяніна **Фельдмана.**

Падала заяву ў гомельскі нарсуд. Суд вынес пастанову вярнуць мне кватэру. Але пастанове гэтай Сіроткін не падпарадкаваўся. Пасля я звярнулася да райпракурора, які прапанаваў начальніку міліцыі першага аддзялення выканаць рашэнне суда.

Начальнік міліцыі даў загад інспектару, але рашэнне суда асталося невыкананым. Пасля гэтага я звярнулася ў адміністратыўны аддзел міліцыі, дзе таксама палажылі яшчэ адну рэзалюцыю—выканаць загад суда.

Не гледзячы на ўсе гэтыя рашэнні і рэзалюцыі я вось ужо цэлы год не магу атрымаць сваёй кватэры.

Г. П. МАЛКІНА.

ПРАКУРОРУ КРУПСКАГА РАЁНА ТАВ. НУСКУЛЬТАРУ

МАСЛАЗАВОД У РУКАХ ЗЛОДЗЕЯ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

Загадчыкам Дубаўскага маслазавода Крупскага раёна працуе Данькін, які сістэматычна раскрадвае масла. Так, аднойчы ён украў адразу 4 пуды, другі раз пуд масла, якое ад яго было забрана міліцыяй.

У 1933 годзе Данькін украў дзве скрыні масла. Аб гэтым работніца Чарняўская М. заявіла ў райсаюз. За гэта Данькін зняў яе з работы. Участковы інспектар Ціпкоў, якому была справа перадана для выкрыцця, добра выпіў з Данькіным і справу змазаў. Жонка Данькіна кожны дзень носіць дамоў слоікі пад відам масляніцы. Данькін сістэматычна пасылае масла сястры ў Ленінград.

ЧАРНЯЎСКІ К.

АД РЭДАКЦЫІ.

Прыходзіцца толькі здзіўляцца таму патуранню злодзею Данькіну, якое мае месца ў Крупках. «Звязда» патрабуе ад пракурора Крупскага раёна тав. Нускультара неадкладнага расследавання справы і прыцягнення да адказнасці Данькіна, як раскрадальніка соцыялістычнай маёмасці.

САКРАТАРУ БАБРУЙСКАГА РК КП(б)Б ТАВ. МІЛЕРУ

У ТУРКАЎСКАЙ ШКОЛЕ АРУДУЕ ВОРАГ

(ПІСЬМО КАЛГАСНІКА)

Туркаўскай няпоўнай сярэдняй школай (Бабруйскі раён) загадвае сын раскулачанага кулака Х. Савіч. Пачынаецца навучальны год, а школа неадрамантавана. У памяшканні школы Савіч малоціць сваё збожжа.

Савіч займаецца цкаваннем маладых настаўніц. Мужа настаўніцы Салукевіч — Таўкачова — ён зняў з работы і выкінуў з кватэры за тое, што Салукевіч не захацела з ім уступіць у палавую сувязь.

Пра гэтыя агіднасці ведае райана, але чамусці на іх не рэагуе.

УМАНАЎ.

АД РЭДАКЦЫІ.

Агідныя факты, прыведзеныя ў пісьме т. Уманава — паказваюць, што кіраўнікі Бабруйскага райана не ведаюць даверанных ім школ людзей, якія кіруюць гэтымі школамі. Сігнал з Туркаўскай школы гаворыць яшчэ і аб тым, што работнікі гэтага-ж райана нячула, па-чыноўніцку адносяцца да сігналу друку. Аб злачынных дзеяннях кулака Савіча райгазета сігналізавала не раз. Але райана на выступленне газеты ніяк не рэагаваў.

«Звязда» патрабуе зняць Савіча з работы і судзіць яго. Райком КП(б)Б павінен неадкладна стварыць калектыву настаўнікаў умовы для работы ў Туркаўскай школе, забяспечыўшы школу добрым кіраўніцтвам.

САКРАТАРУ ТАЛАЧЫНСКАГА РК КП(б)Б тав. ТУРЫКУ.

ПАТУРАЮЦЬ САБАТАЖНІКАМ

(ПІСЬМО БРЫГАДЗІРА)

Па рашэнню бюро Аршанскага РК КП(б)Б 20 жніўня я выехаў у Талачынскі раён для дапамогі ў выкананні плана хлебапаставак. Знаходзячыся ў Паўлаўскім сельсовеце, я высветліў, што абавязацельствы па здачы хлебапаставак і бульбы ў вёсцы Хіталевічы даны такім аднаасобнікам, якія або выбылі ў другі сельсовет, як, напрыклад, **Ф. Заруба,** або такім, якія асуджаны (Міхонаў, Шыпкоў і Ціпкоў). Трыццаці аднаасобнікам гэтай вёскі зусім не даны абавязацельствы.

Цэлы рад аднаасобных гаспадарак не выконваюць мяса- і малакапаставкі, хоць і маюць магчымасць іх выканаць. А раённыя арганізацыі і сельсовет не прымаюць ніякіх мер.

Асобныя брыгадзіры, якіх накіравалі Талачынскі РК КП(б)Б і РВК у сельсоветы **(Белабжэцкі** райснаба, Грэнкоўскі—прадстаўнік ОРС'а завода імя Марці), пабыўшы два дні ў сельсоветах, вярнуліся назад. Аб гэтым сігналізавала райгазета, але РК КП(б)Б і РВК спагнанняў ніякіх не далі гэтым дзезертырам.

САЛАЎЁЎ.

ПА СЛЯДАХ НЕАПУБЛІКАВАНЫХ ПІСЕМ

⊙ Калгаснік калгаса «Прасвет», Люцвінаўскага сельсовета, Парыцкага раёна, пісаў у рэдакцыю аб безгаспадарчасці ў калгасе. «За апошні час», пісаў ён, «у калгасе пала 11 цялят, раскідан пажарны інвентар і т. д.».

Пракурор Парыцкага раёна паведамляе, што факты пацвердзіліся. Вінаватыя прыцягваюцца да судовай адказнасці.

НАРОДЖАНЫЯ ПАЛІТАДДЗЕЛАМ

(З дарожнага блокнота)

Дасяваюцца апошнія гектары азімых. Доўгімі загонамі ідуць трактары і конныя двухпарні. А побач на палях перадавога калгаса паказалася прыгожая, разлінееная радковымі сявалкамі рунь.

Тав. **Вайнман,** начальнік палітаддзела Рагачоўскай МТС, спыняе машыну на палявой дарожцы, пытаецца аб выніках рабочага дня.

— На прыліў сеем. Прыбыла 16 гаспадарак. Сёння заканчваем усю сяўбу,—задаволена адказвае брыгадзір.

Прыліў у калгасы вялікі. За час асенняй сяўбы па чатырох сельсоветах зоны дзейнасці МТС, дзе папрацавалі работнікі палітаддзела, у калгасы ўліліся 350 гаспадарак. Прыліў ідзе штодня. Арганізоўваюцца і новыя калгасы. За вясну і лета арганізавана 25 калгасаў. Процант калектывізацыі павялічыўся ўдвая.

Мы ў калгасе **«Хваля».** Калгас арганізаваўся ў час веснавой пасяўной кампаніі. Але яму могуць пазайздросціць многія «старыя» калгасы.

Тав. Вайнману тут знаём кожны чалавек, кожны будынак, кожны конь. Ён быў арганізатарам гэтага калгаса. Але тав. **Жылінскі,** старшыня калгаса, настойліва цягне паглядзець калгасны двор.

Вялікі роўны пляц з новымі будынкамі.

Жылінскі паказвае стометровую новую павець, канюшню, свіран.

— Сёння на сходзе,—расказвае Жылінскі выбралі з калгасніц санітарную камісію. Яны будуць сачыць за чыстатой, за культурнай абстаноўкай у калгасных хатах і па агульным двары.

Новым, маладым, палітаддзелам створаным, калгасам сёння можна ганарыцца. Ён першы правёў уборку, хлебаздачу, азімую сяўбу, ён атрымаў першую квітанцыю аб поўнай здачы ільну дзяржаве.

Падымаючы клубы белага пылу, машына рухае далей. На дарозе трое дзяўчат-піянерак. Тав. Вайнман зноў спыняе машыну.

Дзяўчаты бягуць насустрач. Гэта «старыя» знаёмыя т. Вайнмана.

— Ну, як-жа ваша звяно, як брыгада, насценгазета?

Піянеркі расказваюць навіны.

— Газета выходзіць, мы ў ёй нашых матак падцягнулі, яны хацелі індывідуальную здзельшчыну сарваць.

Яны наперабой гавораць аб самым цікавым, аб іх першых працаднях у калгасе **«Новы Дабрацін».** Гэта іх першая калектыўная праца. І радасных успамінаў аб ёй хопіць на ўсю школьную зіму.

Да машыны праз паспеўшы вырасці натоўп праціскаецца пажылая кабета.

— Таварыш палітаддзел, я вам сваю крыўду выказаць хачу.

— Кажы, у чым справа, бабулька.

— Дык вось, значыць, папрасіла я яснай саломы, каб гэта кароўцы падаслаць. Тры разы ў нашага старшыні пытала. Так і не далі.

— З якога-ж ты калгаса?

— З «Чырвонага сцяга», **Марозава я.** А цяпер, значыцца, з калгаса мяне выключылі:—За што-ж?

За тое, што гной не аддала. Я-ж саломы не атрымала.

Такія яшчэ ў калгасе адміністратары, што гатовы з пляча рубіць, выключаць не разабраўшы справы.

З гэтага-ж калгаса тут-жа скардзіцца ўчарашні аднаасобнік, што ён прывёў у калгас добрага каня, ды не было добрых калёс і старшыня загадаў купіць мажары ці фурманку, а то не прыме ў калгас.

Тут-жа прыходзіцца прымаць аператыўныя меры, каб васстанавіць зноў у калгасе няправільна выключаных.

Па дарозе вялікі калгас «Чырвоны Крым», у ім 81 гаспадарка. Зараз ідзе прыліў. Два дні таму назад у калгас прынята 41 гаспадарка. Тав. Вайнман спяшыць праверыць, як ідзе замацаванне новых калгаснікаў.

У вёсцы дзейнічае класавы вораг. **Суконнікаў Андрэй** у мінулым годзе арганізаваў выхад з калгаса 20 гаспадарак. Ён дзейнічае хітра і зараз. Уступіў у калгас і дабіўся таго, каб не абагульвалі да нядзелі.

— Трэба з'ездзіць апошні раз на сваім кані ў горад, на базар.

Кіраўнікі сельсовета і раённых арганізацый прамаргалі варожыя ходы Суконнікава.

Сёння Суконнікаў агітуе за выхад з калгаса тых, хто яшчэ як след не ўступіў у калгас, не абагуліў маемасці. Суконнікава лічаць серадняком. Чаму-ж ён выступае супроць калгаса? Варта толькі трохі паскрэбці яго, як лёгка даецца адказ на гэта пытанне. У Суконнікава, як і ў шмат якіх аднаасобнікаў Рагачоўскага раёна, ёсць скрытыя ад абкладання землі. Ён у калгас не збіраецца. Але пойдуць іншыя ў калгас—яго выкрыюць. Таму ён так з усіх сіл намагаецца, каб прыпыніць рост калектывізацыі.

Рост калгасных гаспадарак гэта канец яго—Суконнікавай спекуляцыі.

Работнікамі палітаддзела разаблачаецца Суконнікаў, замацоўваецца прыліў.

Некалькі дзён у вёсцы Пласкіня, Дварэцкага сельсовета, працавалі палітаддзельцы. Тут у вялікай вёсцы павінен быць арганізаван калгас.

Сёння група аднаасобнікаў запрасіла старшыню сельсовета, каб прышоў на арганізацыйны сход, аформіць калгас. Сабраліся ў хаце будучага калгасніка. Старшыня сельсовета **Прохараў** не прыехаў. Сход праводзіцца без яго. Выбралі праўленне, старшыню.

Якую даць назву калгасу? Адзін з новых калгаснікаў прапануе:

— Зараз праходзіць з'езд пісьменнікаў. Там старшынствуе **Горкі.** Назавем калгас **імем Горкага.**

Не згаджаецца адна бабулька.

— Нельга калгас называць Горкім. Мы-ж да добрага жыцця ідзем.

Бачым, што патрэбна спецыяльная гутарка аб літаратуры, аб з'ездзе, аб першым пролетарскім пісьменніку Максіме Горкім.

Перад калгаснікамі паўстаюць вобразы «Буравесніка», «Маці» і новых сялянак-калгасніц з апошняга апавядання «Об избытках и недостатках».

Зараз прапанова аб наданні калгасу імя Горкага сустракаецца аднадушна.

Далёка за поўнач. Канчаецца дзень начальніка палітаддзела, пачаты з усходам сонца—дзень, праведзены ў новаарганізаваных і выпеставаных ім калгасах.

І так штодня тав. **Вайнман,** які ўзнагароджан вышэйшай узнагародай—ордэнам Леніна, кожную чарговую кампанію звязвае з ростам і ўмацаваннем калгасаў.

ЯН. ПАЎЛОЎСКІ.

Рагачоў, верасень.

„НЕБЯСПЕЧНЫЯ ДУМКІ" І „НЕБЯСПЕЧНЫЯ ДЗЕЯННІ"

Уздым стачачнай барацьбы ў Японіі

ШАНХАЙ, 13 верасня. (Інфармацыя «Праўды»). Стачка 11 тысяч рабочых і служачых трамвая і аўтобусаў Токіо, якая пачалася 5 верасня, разгаўжаецца. З першага-ж дня стачкі адміністрацыя пачала вербаваць штрэйкбрэхераў. Гэта, аднак, прывяло да раду аварый, ломкі вагонаў, псавання ліній і інш.

У лістоўцы, пашыранай у Токіо і заклікаючай да салідарнасці, бастуючыя гавораць: «Праект упраўлення гарадскіх чыгунак пад выглядам ліквідацыі дэфіцытнасці гэтых рашыў скараціць нашу зарплату на 40-60 проц. Ажыццяўленне гэтага мерапрыемства пагражае рабочым галоднай смерцю. Скарачэнне нашай зарплаты закране інтарэсы ўсіх працоўных. Калі-б мы згадзіліся на зніжэнне, мы атрымалі-б другіх капіталістаў на кія-ж меры».

Рэакцыйныя фашысцкія арганізацыі адкрыта змагаюцца са стачкай, падтрымліваючы адміністрацыю. У прыватнасці, «саюз рэзервістаў» адкрыў кампанію супроць стачкі, падтрымліваючы штрэйкбрэхераў.

Транспартныя рабочыя дапамагаюць бастуючым; у прыватнасці, транспартнікі Кабэ ўжо аказалі грашовую дапамогу.

Газета «Токіо ніппо», выступаючы супроць стачкі, прыводзіць паведамленне наступнага роду: «Нат людзі з вышэйшай асветай атрымліваюць у Японіі 35-50 іен у месяц».

Агенцтва Рэйтэр сёння паведамляе з Токіо аб тым, што наспявае стачка 100 тыс. маракоў. Маракі высунулі рад патрабаванняў аб зарплаце, пагражаючы ў выпадку адмаўлення стачкай, пачынаючы з 20 верасня. Параходным кампаніям пастаўлен ультыматыўны тэрмін адказаць на прад'ўленыя патрабаванні да 23 верасня.

У артыкуле аб унутраным крызісе Японіі газета «Чэйн із рэпюблік» паведамляе аб наспяванні стачкі рабочых буйнейшага тэкстыльнага канцэрна на «Канегафуці». Газета гаворыць: «Першыя чуткі аб магчымасці падобнай стачкі прывялі да такога падзення акцый канцэрна, што ў адзін дзень страты дасягнулі некалькіх мільёнаў іен». Артыкул далей гаворыць: «Стачкі ў Японіі ўчашчаюцца. Беспрацоўе астаецца сур'ёзным. Лічба ў два і больш мільёны беспрацоўных прыводзіцца афіцыяльна. Урад вельмі ўстрывожан развіццём падзей. Стачкі выражаюць сабой адчайнае супраціўленне зніжэнню зарплаты, якое пагражае цяпер усім прамысловым рабочым Японіі.

Вострае нездаваленне выражае сялянства, асуджанае на пастаянную галечу і вымушанае плаціць невыносныя падаткі».

Аўтар артыкула чуў размовы сялян, якія, на яго думку, немыслімы былі некалькі год назад. Яны адкрыта абрушваюцца на капіталістаў, банкіраў, называючы Міцуі і Сумітомо (буйнейшыя японскія канцэрны) прыгнятальнікамі. Аб'ехаўшы Японію, можна пераканацца, наколькі дрэнна эканамічнае становішча краіны. Урад баіцца, што небяспечныя думкі могуць перайсці ў небяспечныя дзеянні.

[П]ОЛЬСКАЯ „БОМБА" Ў ЛІЗЕ НАЦЫЙ

[Ж]ЭНЕВА, 13 верасня. (Інфармацыя «Праўды»). Сенсацыяй сёння[шняга] пасяджэння пленума Лігі [на]цый з'явілася прамова польскага міністра замежных спраў [Бэ]ка. Гэта прамова была цалкам [пры]свечана пытанню аб нацыяна[ль]ных меншасцях і па сутнасці [з'я]ўляла аб растаржэнні польскім [ур]адам існуючага дагавора аднос[на] абароны нацменшасцей.

Бэк пачаў з гісторыі спроб [По]льшчы дабіцца змены існуючага становішча і паўторна заявіў, [шт]о неабходна «радыкальная рэформа». Далей ён з вялікай рэ[за]нцю і амаль у тоне ультыматума паставіў усутыч перад сесіяй [пр]апанову аб замене існуючага [да]гавора новым пагадненнем, якое [за]крапала-б усе, а не толькі па[с]обныя, дзяржавы.

«Польскі ўрад, — заявіў ён, — [пр]апануе сесіі выказацца аб прызнанні неабходнасці ўсеагульнай [кан]венцыі аб абароне меншасцей, [д]ругое, аб скліканні для гэтай [мэ]ты міжнароднай канферэнцыі. [По]льскі ўрад разлічвае на ясны і [не]двузначны адказ на абодва гэ[ты]я пытанні».

Бэк адзначыў сваю ўпэўненасць [у] тым, што яго прапанова не сустрэне асаблівага спачування. «Інфармацыя, якую я атрымаў па пленуме ў мінулым годзе, не разлічана, аднак, на тое, каб настроіць мяне аптымістычна. Я ўпэўнен, што думка большасці прадстаўленых тут урадаў не змянілася».

Не гледзячы на гэту вемінуччую апазіцыю, прадстаўнік Польшчы з падкрэсленай афіцыяльнасцю заявіў: «Настойваючы на ўвядзенні ў сілу агульнай і аднастайнай сістэмы абароны меншасцей, мой урад бачыць сябе вымушаным з гэтага часу адмовіцца ад усякага супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі ў пытанні аб нагля дзе над прымяненнем Польшчай сістэмы абароны меншасці».

Пасля выступлення Бэка дыскусія была адкладзена з прычыны таго, што ніхто не пажадаў выступіць. Растаржэнне Польшчай дагавора аб нацменшасцях зрабіла вялікае ўражанне на сесію і расцэньваецца, як сур'ёзны знешнепалітычны крок. У кіруючых жэнеўскіх колах гэты крок разглядаецца, як імкненне нанесці ўдар Лізе нацый. У гэтых-жа колах указваюць, што польскае выступленне аб'ектыўна падтрымлівае працаўнікаў Лігі.

НОВЫ ЗАВОД ІЗАЛЯЦЫЙНЫХ ПЛІТ

Пляцоўка галоўнага корпуса завода ізапліт. На перыферыі размешчаны будматэрыялы (цэгла, камень і інш.).

У Нова-беліцы будуецца завод ізаляцыйных пліт. Асноўнай сыравінай для вырабу цепла-і гукаізаляцыйных пліт з'яўляюцца адыходы каніфольнага завода (экстрагіраваная шчапа) і часткова драўляныя адыходы запалкавай фабрыкі «Везувій».

Да гэтага часу ізаляцыйныя пліты з драўніны ў прамысловасці зусім не прымяняліся і пытанне атрымання іх пакуль што прапрацавана ў лабараторных умовах.

Па сваіх фізіка-механічных паказальніках ізаляцыйная пліта блізка падыходзіць да пробкі. Яна вельмі лёгкая і мае дастатковую механічную трываласць. Па цеплавых уласцівасцях адзін сантыметр ізаляцыйнай пліты можна замяніць трыма сантыметрамі цэглы і 25 сантыметрамі жалезабетона.

Пры каменнай кладцы карпусоў сцяна ў адну цагліну з ізаляцыйнай плітамі дае амаль аднолькавы каэфіцыент цеплаўстойлівасці з сцяной у 2,5 цагліны без ізаляцыі, пры лепшым тэрмічным супраціўленні. Прычым кошт работ патаняецца на 45 проц. у параўнанні з цагельнай кладкай.

Пры ўжыванні ізаляцыйных пліт зусім адпадаюць тынкавальныя работы ўнутры памяшкання, бо самі ізаляцыйныя пліты маюць гладкую і прыгожую паверхню і можна ім надаць любы колер.

Апрача таго, так званыя драўляна-валакністыя пласціны (сюды адносяцца і ізаляцыйныя пліты) можна смела прымяняць пры самалётабудаўніцтве. Часткова нават для замены каляровага метала.

Праектная магутнасць завода разлічана на выпуск 620 тыс. квадратовых метраў у год, на суму каля 2 мільёнаў руб.

Згодна рашэнняў урада СССР і БССР будаўніцтва завода павінна быць закончана ў III квартале 1935 года. На сёнешні дзень поўнасцю загатоўлен увесь будаўнічы матэрыял. Усе падрыхтоўчыя работы закончаны і прыступілі да закладкі фундамента галоўнага корпуса. Агульныя капіталаўкладанні першай чаргі складаюць 2 млн. 65 тыс. руб.

Пры гэтым-жа заводзе прадугледжана пабудова новага цэха прасаванай драўніны. (лігнастон).

* * *

Для навуковай прапрацоўкі ўсіх пытанняў, звязаных з вырабам ізаляцыйных пліт, пры Гомельскім навукова-даследчым інстытуце лясной гаспадаркі і лесахіміі арганізуецца спецыяльная лабараторыя, якая будзе абсталявана радам складаных машын, як гідраўлічныя прэсы, прэсформы, варачныя катлы, аўтаклавы, драбільна - расціральныя машыны, кантрольна-вымяральныя прыборы, хімічныя рэактывы і інш.

Інжынер В. КАРСАКОЎ.

125 ТЫС. РУБЛЁЎ НА РАМОНТ РАБОЧЫХ КВАТЭР

На рамонт рабочых кватэр, інтэрнатаў, гаіродпехаваленнь і на арганізацыю рамонту вопраткі і абутку для рабочых прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці СНК БССР выдзеліў 125 тыс. руб.

ФІНПЛАН III КВАРТАЛА ВЫКАНАН ДАТЭРМІНОВА

Любанскі раён на аснове разгортвання масавай работы сярод калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў выканаў да 9 верасня план мабілізацыі сродкаў насельніцтва трэцяга квартала на 104,5 проц. План па аграмаджанаму сектару выканан на 94,5 проц.

Сакратар РК КП(б)Б КАРДАШ.
Старшыня РВК КЛІМАЎ.

Аб распрацоўцы і папулярызацыі вынікаў першага ўсесаюзнага з'езда савецкіх пісьменнікаў

Пастанова бюро Менскага гаркома КП(б)Б

Надаючы выключна важнае палітычнае значэнне папулярызацыі вынікаў першага ўсесаюзнага з'езда савецкіх пісьменнікаў і ў мэтах яшчэ большага ўзмацнення партыйнага кіраўніцтва менскай арганізацыяй пісьменнікаў, бюро ГК КП(б)Б пастанаўляе:

1. На буйных прадпрыемствах горада (завод імя Варашылава, фабрыка «Окцябр», завод імя Мяснікова, завод «Бальшэвік», фабрыка імя Кагановіча і завод «Комунар») правесці спецыяльныя сходы рабочых з дакладамі і выступленнямі ўдзельнікаў з'езда пісьменнікаў.

Аддзелу культуры і прапаганды ленінізма ГК т. Варончанка разам з партгрупай саюза савецкіх пісьменнікаў (т. Александровічам) намеціць таварышоў для выступлення.

2. Прапанаваць усім сакратарам парткомаў астатніх прадпрыемстваў і ўстаноў арганізаваць прапрацоўку з'езда шляхам правядзення сходаў, гутарак і т. д.

3. Прапрацоўку на прадпрыемствах правесці з 17 верасня. Прапанаваць парткомам скарыстаць папулярызацыю вынікаў з'езда для палепшання работы літгурткоў, памятаючы, што за пастаноўку работы літгурткоў адказвае непасрэдна партыйная і прафсаюзная арганізацыі прадпрыемства.

4. 18 верасня правесці сход цэнтральнага і гарадскога партыйнага, савецкага, прафсаюзнага і камсамольскага актыва з дакладам т. Александровіча аб выніках першага ўсесаюзнага з'езда савецкіх пісьменнікаў, з выступленнямі ўдзельнікаў з'езда.

5. Даручыць аддзелу культуры і прапаганды ленінізма ГК разам з цэнтральнай бібліятэкай імя Леніна правесці агульны сход работнікаў бібліятэк (гарадскіх і заводскіх), дзе паставіць даклад аб выніках з'езда пісьменнікаў і задачах бібліятэчных работнікаў па рабоце з чытачамі.

6. У мэтах папулярызацыі вынікаў з'езда сярод шырокіх мас рабселькораў уключыць у парадак дня раённага злёта рабселькораў даклад аб выніках першага ўсесаюзнага з'езда савецкіх пісьменнікаў.

Сакратар Менгаркома КП(б)Б РЫСКІН.

У СОЎНАРКОМЕ БССР

УСЕБЕЛАРУСКАЯ АЛІМПІЯДА САМАДЗЕЙНАГА МАСТАЦТВА

Соўнарком БССР зацвердзіў прапанову Наркомасветы аб арганізацыі ў кастрычніку г. г. усебеларускай алімпіяды рабоча-калгаснага самадзейнага мастацтва. Для правядзення алімпіяды выдзелена камісія пад старшынствам нам. наркомасветы тав. Дунца, у складзе тт Гурчанка (культпроп ЦК КП(б)Б), Эціна (палітсектар МТС НКЗ), Рабчынскага (ЦК ЛКСМБ), Рубінштэйна (ЦСПСБ), Гальнікава (НКАсветы), Грыцкевіча (ЦП працасветы), Ефімава (ЦП прапмастацтва) і Любана (камітэт радыёвяшчання).

СТЫПЕНДЫІ ДЛЯ ЮНЫХ ДАРАВАННЯЎ

Для дзяцей, якія адзначаюцца асаблівымі музычнымі здольнасцямі, Соўнарком БССР устанавіў павышаную стыпендыю ў размеры 200 руб. у месяц. Народнаму камісарыяту асветы прапанавана выдзеліць для гэтых дзяцей спецыяльнае памяшканне ў інтэрнаце кансерваторыі і выдзеліць сродкі для іх індывідуальнага навучання.

НА ПЕРШЫМ МЕСЦЫ У САЮЗЕ

З пачатку II квартала гэтага года ЦК саюза гарбароў і дзяржаўным трэстам «Дубіцель» быў абвешчан усесаюзны конкурс на лепшае прадпрыемства дубільна-экстрактнай прамысловасці.

Рэчыцкі дубільна-экстрактны завод адным з першых уключыўся ў гэты конкурс і за 3 месяцы ўдарнай работы дабіўся велізарных поспехаў. Вытворчая праграма па ўсіх паказальніках значна перавыканана.

Рашэннем журы па конкурсу завод атрымаў першую прэмію пераходны чырвоны сцяг ЦК саюза гарбароў і 12 тыс. руб.

ПАДНЯСЕНСКІ, СТАРЫКОЎ, ТУМІЛОВІЧ.

ТЭАТР, ЦЫРК, ЭСТРАДА

⊙ Яўрэйскі Дзяржаўны Тэатр БССР пачаў зімні сезон 11 верасня п'есай Бергельсона «Глухі», 13 верасня адбудзецца юбілейны—150-й паказ «Ботвіна» Веверкі. Чэстванне юбіляраў—акцёраў, якія гралі ў гэтай п'есе 150 раз, перанесена на 17 верасня.

⊙ 5-га верасня ў памяшканні гомельскага цырка-тэатра пачаў зімовы сезон Трэці Беларускі дзяржаўны тэатр. На адкрыцці сезона была дана п'еса Мікітэнкі «Дзяўчаты нашай краіны» ў пастаноўцы заслужанага артыста рэспублікі Е. Міровіча. Наступнай пастаноўкай ідзе камедыя Шкваркіна «Чужое дзіцё».

Тэатр рыхтуе прэм'еру камедыю маладога драматурга Левіна «Гісторыя пяці хвастоў» і пачынае работу над прэміраванай на конкурсе СНК СССР п'есай Качаргі «Часаўшчык і курыца». Пастаноўка п'есы Качаргі даручана тав. Міровічу.

⊙ Другі Беларускі дзяржаўны тэатр п'есай Рамашова «Байцы» адкрыў 6-га верасня зімовы сезон у Віцебску. З 9-га верасня ў тэатры ідзе «Вздор Фінна».

⊙ Гомельскі тэатр рабочай моладзі 15-га верасня адкрывае двухмесячныя курсы без адрыву ад вытворчасці з мэтай далейшага пашырэння свайго акцёрскага калектыва.

За чатыры гады свайго існавання, асабліва пастаноўкамі «Любовь в упряжке» і «Фортшпандал», гомельскі ТРАМ вырас у значную мастацкую сілу. Непасрэдны ўдзел у рабоце ТРАМ'а прымае заслужаны артыст рэспублікі тав. Міровіч.

⊙ Эстрадна-цыркавое бюро Наркомасветы БССР вядзе перагаворы аб арганізацыі ў Беларусі канцэртаў вядомага музыкі праф. Галавіна, артыста вялікага тэатра Казлоўскага (тэнар) і вядомай выканаўцы народных спеваў артысткі Загорскай. Бюро арганізуе ўласныя эстрадныя брыгады для абслугоўвання нацменшасцей—польскую, яўрэйскую, латышскую.

⊙ На працягу зімовага сезона ў Беларусі будзе дэманстравацца перасоўны звярынец.

МЕНСК



На акруговай спартакіядзе БВА т. П. В. САФРОНАЎ заняў першае месца па знарадавай гімнастыцы. НА ЗДЫМКУ: т. Сафронаў на турніку.

НА МЕНСКІМ ПРЫЗЫЎНЫМ ПУНКЦЕ арганізаваўся тры прызыўныя камісіі. Камісіі заключылі соцдагавор на лепшае правядзенне прызыва і выклікалі на соцспаборніцтва прызыўны пункт Магілеўскага райваенкамата.

КУСТАВАЯ ГАРАДСКАЯ І РАЁННАЯ НАРАДА БІБЛІЯТЭКАРАЎ па папулярызацыі рабоце масавых бібліятэк першага ўсесаюзнага з'езда савецкіх пісьменнікаў адбылася 13 верасня. На нарадзе прысутнічала каля 50 бібліятэкараў.

ВЫСТАЎКУ, ПРЫСВЕЧАНУЮ ОКЦЯБРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ, пачаў рыхтаваць Беларускі дзяржаўны музей.

АДНАДЗЕННЫ ДОМ АДПАЧЫНКУ «ЎДАРНІК» учора закрыўся. За лета ў доме адпачывалі 21.421 рабочы-ўдарнік.

БУДАЎНІЧАЯ ВЫСТАЎКА на тэрыторыі былой сельска-гаспадарчай выстаўкі пасля месячнага рамонту адкрываецца 20-га верасня. На выстаўцы ёсць аддзелы жыллёвага, прамысловага і сельскагаспадарчага будаўніцтва, драўлянай і жалезнай канструкцый, канструкцыі сцен і перагародак, апаяў і вентыляцыі і т. д.

АВІЯПОШТА Ў БССР функцыянуе з 23 чэрвеня. За чэрвень налётана 62 гадзіны 5 мінут, ліпень — 377 гадзін 10 мін. Па плану ў месяц прадугледжваюцца 24 рэйсы на кожны самалёт, а праводзіцца па 30-31 рэйс. Нагрузка самалёта — 200 кілаграмаў.

У ФОНД ДАПАМОГІ БАЦЬКАМ РЭВОЛЮЦЫІ ў фашысцкіх краінах ад рэалізацыі ўраджаю з мопраўскіх гектараў у ЦК МОПР'а БССР наступіла 54.148 р., ад зборы ўцільсыравіны на лёгкай прамысловасці — 68.246 руб.

Па СССР

[К.] Е. ВАРАШЫЛАЎ [ВЯ]РНУЎСЯ [У] МАСКВУ

МАСКВА, 13 верасня. (БЕЛТА). [...] верасня ў Маскву вярнуўся з [сл]ужбовай паездкі на Украіну, Бе[ла]русь і Заходнюю вобласць народ[ны] камісар абароны Саюза ССР К. Е. Варашылаў.

ПАДЗЯКА ГЛАВЫ ІТАЛЬЯНСКАЙ ВАЕННАЙ ДЭЛЕГАЦЫІ

МАСКВА, 13 верасня. (БЕЛТА). Нарком абароны Саюза ССР тав. К. Е. Варашылаў атрымаў з Менска ад главы італьянскай ваеннай дэлегацыі генерала Грацыолі тэлеграму наступнага зместу: «Пры пераездзе граніцы хачу яшчэ раз выказаць вялікую падзяку за выключны прыём, аказаны нам у СССР».

[П]ершы Дзяржаўны Тэатр (БДТ—1)
[Маст. кір. засл. арт. рэсп. Л. М. ЛІТВІНАЎ]
[сёння]
ЗЯМЛЯ І НЕБА
драма у 4 дзеях.
Пачатак ў 8 гадзін вечара.

[Гу]кавы кіно-тэатр [«Чы]рвоная Зорка». Гукавы мастацкі фільм ВЯСЕННІЯ ДНІ
На летняй эстрадзе—канцэрт

[Гу]кавы кіно-тэатр [«П]ролетарый». Гукавы мастацкі фільм НАСТЕНЬКА УСТИНОВА
У фаэ канцэрт Музджаза

Кіно «Інтэрнацыянал». Мастацкі фільм АМОК (Закон Габаяўлен)

Кіно «Спартак». Нашумеўшы кіно-фільм СПАРТАК
Драма ў 7 частках.

СМАЛЯНСКІ ТЭХНІКУМ НАСЕНАВОДСТВА,
[які] рыхтуе аграномаў-насенняводаў, ПРАДАЎЖАЕ НАБОР СТУДЭНТАЎ [н]а 1 курс тэхнікума. Прымаюцца ва [уз]росце ад 16 да 30 год, якія маюць [а]дукацыю за сямігодку. Іспыты: па [бе]ларускай мове, матэматыцы, фізіцы, [хі]міі і грамадазнаўству — з 20 па 28 [ве]расня. Пры тэхнікуме ёсць гаспа[да]рка, сталовая, лазня і пральня. 70 проц. прынятых забяспечваюцца [ст]ыпендыяй; інтэрнатам забяспечваюцца ўсе.
[З]аявы з дакументамі аб сацстановішчы, здароўі, асвеце, метрыку, завераную сельсоветам анкету і 2 фотакарткі дасылаць да 20 верасня па адрасу: [ст]-а. Смаляны, Аршанскага раёна, тэхнікуму.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ДА УВАГІ АЎТАГАСПАДАРАК
АЎТАМАБІЛЬНА-РАМОНТНЫ ЗАВОД
[у] Магілеве (БССР, станцыя Лупалава. За [ста]нік чыг.) прымае на сябе расточку [ц]ыліндраў блока машын „Фэрд" пад усе рамонтныя размеры.
Заводакіраўніцтва.

ВУЧЭБНЫ КАМБІНАТ „ВОСУ"
(Усесаюзнае таварыства соцыялістычнага ўчота)
аб'яўляе ПРЫЕМ на 1934-35 навучальны год
па падрыхтоўцы кадраў і павышэнню кваліфікацыі—у наступныя групы:

I.
Знаменіты ўчота вышэйшай кваліфікацыі. Тэрмін навучання —3 гады. Плата за навучальны год 350 руб.
Прымаюцца: галоўныя і ст. бухгалтары і іх намеснікі і бухгалтары (стаж не менш 3 г.).

II.
Бухгалтары: Тэрмін навучання 10 месяцаў. Плата за курс—325 р. Прымаюцца: маючыя стаж рахунковай работы не менш 2 год

III.
Памбухі і рахункаводы. Тэрмін навучання 10 мес. Плата за курс 250 р. Прымаюцца: маючыя асвету 5-7 класаў.

IV.
Эканамісты-планавікі сярэдняй кваліфікацыі.
Тэрмін навучання 10 месяцаў. Плата за курс—325 руб. Прымаюцца: работнікі планавых аддзелаў і статыстыкі, маючыя стаж 2-3 гады.

Адначасова арганізуюцца наступныя каротка тэрміновыя групы па павышэнню кваліфікацыі:

V.
Для галоўных бухгалтараў і іх намеснікаў. Тэрмін навучання 6 мес. Плата за курс 300 р.

VI.
Для старшых бухгалтароў бухгалтараў. Тэрмін навучання 8 мес. Плата за курс 300 р.

VII.
Для рахункаводаў (з невялікім практычным стажам). Тэрмін навучання 6 мес. Плата за курс 225 руб.

Заняткі вячэрнія.

Прыём слухачоў праводзіцца па камандыроўках арганізацый і індывідуальна.
Даведкі і анкеты выдаюцца ў канцылярыі камбіната „ВОСУ" (Рэвалюцыйная, 3, тэл. 25-345) з 10 да 12 г. дня і з 7 да 9 г. вечара. Прыём да 1 кастрычніка.
Камбінат „ВОСУ" таксама заключае дагавары з асобнымі сістэмамі на арганізацыю спецыяльных груп па павышэнню кваліфікацыі працуючых і па падрыхтоўцы ўчотных кадраў для перыферыі.
ДЫРЭКЦЫЯ.

ЗАГАД № 139

па Менскаму гарнізону ад 12 верасня 1934 г.

На падставе загада Наркамасветы БССР ад 4.IX-34 г.

„Аб рэгістрацыі бібліятэк" прапаную:

усім прадпрыемствам і ўстановам, у веданні якіх знаходзяцца бібліятэкі, зарэгістраваць іх у Менскім гарана, у палітасветінспектуры (горсовет, 2-гі паверх, 29 пакой) не пазней 25 верасня 1934 г.

У часе рэгістрацыі бібліятэк даць весткі, згодна загада НК ад 4.IX—34 г. (быў змешчан у друку).

Рэгістрацыя бібліятэк праводзіцца штодзенна з 12 да 2 гадзін дня.

Заг. Гарана КУЗНЯЦОВА.

Барысаўская школа леспрамгасвуча

«ЛПВ» траста «ЛЕСБЕЛ» АБ'ЯЎЛЯЕ АСЕННІ НАБОР У 180 ЧАЛАВЕК ПА НАСТУПНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ:

1. Кваліфікаваных рабочых па валцы, рыскрыжоўцы і раздзелцы лесу—90 чал.
2. Кваліфікаваных рабочых па малявому і плытавому лесасплаву—60 чал.
3. Кваліфікаваных рабочых па пярвічнай механічнай перапрацоўцы драўніны—30 чал.

Тэрмін навучання 6 месяцаў (два месяцы тэорыі, 4 месяцы вытворчай практыкі).

Усе прынятыя забяспечваюцца інтэрнатам, сталоўкай. Забеспячэнне па 1 спісу 1 катэгорыі. Стыпендыя — у залежнасці ад паспяховасці ад 40 да 50 руб. У часе вытворчай практыкі вучні дадаткова атрымліваюць зарплату за выконваемую работу.

Па сканчэнню школы накіроўваюцца на пастаянную работу ў леспрамгасы і сплаўканторы ў якасці кваліфікаваных рабочых.

Узрост прымаемых ад 17 да 25 год з адукацыяй 5-6-7 груп сямігодкі.

Да заявы падаць: даведку аб соцстановішчы бацькоў і сям'і, аб праве голаса, аб адукацыі, метрыку, аб стане здароўя, заверанную анкету. Адрас: г. Барысаў, Андрэеўская вул., 22. Лесашколе.

Прыём заяў з 25 [...]. Пачатак заняткаў [...]

Дырэктар лесшколы [...]

Даводзіцца да ведама ўсіх падпісчыкаў, што нумар 16 журнала

«БОЛЬШЭВІК БЕЛАРУСІ»

выходзіць з друку 18-IX—34 г. з наступным зместам:

Н. Ф. ГІКАЛО — Новая хваля калгаснага прыліву. — Аб задачах «Бальшэвіка Беларусі».
А. СЦЯПАНАЎ, Н. АКСЮЧЫЦ, Н. СЕВАСЦЯНАЎ — Пагоня за лічбамі.
С. Н. МАЛІНІН, А. М. ВАСІЛЬЕЎ, Б. Д. РЫВІНА, Л. І. ФОНГАУЗ — супроць апартуністычных установак у пытаннях прадукцыйнасці працы ў тарфяной прамысловасці.
Е. Г. КІСЯЛЁЎ — Аб арганізацыі марксісцка-ленінскай вучобы партактыва.
Г. БРЫГНЕВІЧ — Палітаддзел у барацьбе за бальшавіцкія калгасы.
А. ДЫНДЗІН — Стварыць уласную кармовую базу свінасаўгасам.
КАНСУЛЬТАЦЫЯ
РОЗЕНБЛЮМ І БАРАНАВЕЦ — Аб чаргаванні раслін у севазвароце.
Кніжная паліца.
Пастановы ЦК КП(б)Б.

РЭДАКЦЫЯ.

Менскай МТМ
Чэрвеньскі тракт, 77
ПАТРЭБНЫ
слесары-механікі - манцёры
4, 5, 6, 7 разрадаў, ведаючыя рамонт аўтамабіляў і трактароў.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Памяці прафесара Е. І. Барычэўскага

Цяжка губляць чалавека, якога ведаеш, у якога вучыўся.

Еўгені Іванавіч Барычэўскі быў чалавекам высокай культуры, чалавекам кіпучай энергіі, выдатным прафесарам.

Студэнты і пісьменнікі добра ведалі і паважалі тав. Барычэўскага. Адзін з лепшых лектараў і знаўцаў старажытнай і еўрапейскай літаратуры, ён шмат даў нам і шмат дапамог.

Тав. Барычэўскі напісаў рад навуковых работ па паэтыцы, якія з'яўляюцца ўкладам у нашу савецкую літаратуру, на якіх многія з нас вучыліся і працавалі.

Янка Купала, Андрэй Александровіч, Платон Галавач, Барыс Мікуліч, Сяргей Знаёмы, Валеры Маракоў, Алесь Дудар, П. Катулеў, С. Левін, Пятляновіч, Пятрусь Броўка, Алесь Кучар, М. Модэль, М. Багун, М. Аляхновіч, Р. Мурашка.

* *

У асобе Еўгенія Іванавіча Барычэўскага раптоўная смерць вырвала з нашых радоў адданага і высокаквалфікаванага навуковага працаўніка.

Еўгені Іванавіч—адзін з прадстаўнікоў той лепшай часткі старой інтэлегенцыі, якая рашуча стала на бок пралетарскай рэвалюцыі.

Усе свае здольнасці і багатыя веды ён аддаў справе падрыхтоўкі і выхавання пралетарскіх кадраў на культурным фронце.

Навуковыя працаўнікі ВПІ: А. МЕЛЬЦЭР, ПЕРЦАЎ, ЗАМОЦІН, ПАЛОНСКІ, БАРЫСЕНКА, ТУРБОВІЧ, ЕАРОДЗІЧ.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Пробныя заняткі для таварышоў, ахопленых сеткай партасветы пры Доме партактыва, з такрамя ўсіх прапагандыстаў-выкладчыкаў, адбудуцца 16 верасня ў 6 г. вечара ў Доме партактыва.

Яўка ўсіх абавязкова.

АДДЗЕЛ КУЛЬТУРЫ І ПРАПАГАНДЫ ЛЕНІНІЗМА ГК КП(б)Б.

16 верасня г. г., у 1 гадзіну дня гарком КП(б)Б у памяшканні ГК, пакой № 50 склікае нараду па рабоце гарсовета «Прыхільнік дзяцей».

На нараду выклікаюцца: ад культаддзела ЦСПСБ — т. Рубінштэйн, ад ЦС «Прыхільнік дзяцей» — т. Краўцоў, ад ЦК Памдапт — т. Майаў, ад гарана — т. Кузняцова, ад гаргадзева — т.т. Ізраіцель і Кантаровіч, ад ДКО ЦК ЛКСМБ, ад ГК ЛКСМБ — т. Анціпенка, ад радыёкамітэта, Белдзяржкіно — т. Марголін, загадчык клуба будаўнікоў т. Стэрлін, загадчык клуба харчавікоў — т. Гольдштэйн і ад саду «Профінтэрн» — т. Турэцкі.

МЕНГАРКОМ КП(б)Б.

Менск, друкарня «Звязды».

Выпускаючы — Р. ДОДЗІН, ст. карэктар — БЯРОЗАВІК, ст. стэрэатыпёр — Е. КАГАН, ст. друкар — З. РУБІН.

Нам. адк. рэдактара А. ДЖЭЛЮК.

Уп. Галоўлітбела № 3221.